СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 4.37, 21.45, 17.08;
Віцебск — 4.19, 21.44, 17.25;
Магілёў — 4.27, 21.34, 17.07;
Гомель — 4.33, 21.22, 16.49;
Гродна — 4.54, 21.59, 17.05;
Брэст — 5.04, 21.50, 16.46.
МЕСЯЦ:
Апошняя квадра 23 чэрвеня.
ІМЯНІНЫ:
Варфаламея, Варнавы, Яфрэма;
Яна.

ЗВЯЗДА

24 ЧЭРВЕНЯ 1992 г.
серада, № 125 (21903)
● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

ВІЗІТ У ПОЛЬШЧУ

Афіцыяльная цырымонія сустрэчы беларускай дэлегацыі прайшла на пляцы каля Бельведэрскага палаца. Станіслава Шушкевіча вітаў прэзідэнт Польшчы Лех Валенса.

Гучаць Гімны Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Польшча. Станіслаў Шушкевіч разам з Лехам Валенсам абыходзяць ганаровую варту Войска Польскага.

Пасля ўрачыстай сустрэчы пачынаюцца перагаворы адзін на адзін Станіслава Шушкевіча і Леха Валенсы. Затым яны пераходзяць у Зялёную залу, дзе ў размову падключаюцца члены беларускай дэлегацыі і прадстаўнікі кіраўніцтва Польшчы. Вынікам іх стала падпісанне «Дагавору паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве».

(БЕЛТА).

ЗВАРОТ

Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Дарагія суайчыннікі!

3 ліпеня 1944 года — адна з самых памятных дат у нашай гісторыі. 48 гадоў назад была вызвалена сталіца Рэспублікі Беларусь горад Мінск. Гэты дзень адзначаецца як свята вызвалення ўсёй беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, як сімвал подзвігу тых, хто адстойваў незалежнасць нашай шматпакутнай зямлі на фронце, у партызанскім атрадзе, у падполлі.

Свабода дасталася вельмі дарагой цаной — загінулі мільёны людзей, таму гэты дзень заўсёды адзначаецца і з радасцю, і са слязамі на вачах. Прайшло амаль паўвека, але па-ранейшаму ў сэрцах людскіх жывая памяць аб тых, хто не дажыў да перамогі.

Напярэдадні 48-й гадавіны вызвалення Беларусі мы звяртаемся да вас, грамадзяне незалежнай рэспублікі, да вас, народныя выбраннікі, хто прадстаўляе органы ўлады ўсіх узроўняў, да вас, кіраўнікі працоўных калектываў, да вас, прадстаўнікі маладога пакалення, з заклікам зберагчы добрыя традыцыі нашага народа. Мы выказваем надзею, што ў горадзе Мінску, гарадах і раёнах усёй рэспублікі пройдуць урачыстыя сходы, адбудуцца мітынгі, сустрэчы аднапалчан, воінаў і партызан. Упэўнены, што будзе арганізавана работа па добраўпарадкаванню помнікаў, мемарыяльных комплексаў, месцаў пахавання загінуўшых воінаў і партызан, мірнага насельніцтва, будуць ускладзены да гэтых святых месцаў вянкі і кветкі.

Аддаючы даніну памяці загінуўшым, усім ахвярам вайны, сардэчна і шчыра віншуем са святам былых салдат, партызан, падпольшчыкаў, усіх, хто перажыў жахі вайны. Ва ўмовах спаду вытворчасці, росту цэн многія з іх зведваюць зараз матэрыяльныя цяжкасці, і найпершы абавязак мясцовых органаў улады, кіраўнікоў працоўных калектываў—аказаць ім неабходную дапамогу. Мы перакананы, што лепшы час наступіць.

З надыходзячым святам!

З Днём вызвалення Рэспублікі Беларусь!

ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Беларусь адчыняе дзверы ў еўрапейскі дом

Як паведамлялася, з 16 па 21 чэрвеня ў Швейцарыі з дзелавым візітам знаходзілася ўрадавая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале са Старшынёй Савета Міністраў В. Ф. Кебічам.

Упершыню Жэнева прымала гасцей з Беларусі ў якасці прадстаўнікоў самастойнай, незалежнай дзяржавы. Сталіца Швейцарыі вядомая ў свеце і ў Еўропе як цэнтр міжнароднага палітычнага і эканамічнага жыцця. Тут знаходзіцца Палац нацый, функцыяніруе Еўрапейскае аддзяленне ААН, працуе Міжнародная арганізацыя працы (МАП). Сюды імкнуцца палітычныя і дзелавыя людзі з усяго свету, каб абмеркаваць бягучыя і перспектыўныя праблемы. Дзверы ў сусветную палітыку адкрываюцца ў Жэневе — такое напісанае правіла. Іменна тут перш за ўсё павінны паказаць сябе, прайсці своеасаблівую прэм'еру дзяржавы і лідэры, якія імкнуцца далучыцца да сусветнага цывілізаванага супольніцтва.

Такім «выхадам у свет» і стала выступленне кіраўніка беларускага ўрада на пленарным пасяджэнні 79-й сесіі Міжнароднай канферэнцыі працы. Напярэдадні ў жэнеўскім Палацы нацый В. Ф. Кебіча цёпла віталі генеральны дырэктар аддзялення ААН у Жэневе пан Бланка і генеральны дырэктар МАП пан Хансен. Адзначалася, што ўпершыню за ўсю гісторыю МАП з яе трыбуны перад сусветным супольніцтвам паўстане незалежная Рэспубліка Беларусь.

У ходзе гутаркі В. Ф. Кебіч, выказаўшы падзяку за аказаны высокі гонар выступіць на канферэнцыі, звярнуў увагу пана Хансена на дзве праблемы: выкарыстоўваючы шырокія магчымасці МАП, арганізаваць пастаянную кансультатыўную дапамогу рэспубліцы ў стварэнні рынкавай інфраструктуры, а таксама наладзіць праз сістэму інстытутаў МАП навучанне і падрыхтоўку спецыялістаў у галіне рынкавага кіравання. Генеральны дырэктар МАП пан Хансен з цікавасцю аднёсся да пастаўленых праблем і выказаў жаданне больш грунтоўна пазнаёміцца з нашай рэспублікай, яе гісторыяй і культурай.

Выступленне Старшыні Савета Міністраў В. Ф. Кебіча на пленарным пасяджэнні МАП выклікала самую добразычлівую рэакцыю залы. Прадстаўнікі розных краін, выстраіўшыся ў жывую чаргу, павіншавалі В. Ф. Кебіча, а ў яго асобе незалежную Беларусь з паспяховым прадстаўленнем перад сусветным супольніцтвам.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ВОЗГАЛАС

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ: ЯКІМ БУДЗЕ ПЕРАХОД АД СЛОЎ ДА СПРАВЫ?

Размоў аб прыватызацыі мы чуем шмат. А колькасць беларускіх прадпрыемстваў, чый працоўны калектыў праявіў настойлівасць і ўзяў прадпрыемства ў арэнду альбо ўжо выкупіў маёмасць, ператварыўшыся ў акцыянернае таварыства ці народнае прадпрыемства, — невялікая, усяго 117.

У асноўным гэта дробныя і сярэднія прадпрыемствы прамысловасці, будаўніцтва, сферы абслугоўвання.

У кошце маёмасці, якая падлягае прыватызацыі, іх удзельная вага складае 1,3 працэнта. Астатняе па-ранейшаму ў руках дзяржманаполій.

Вось чаму народныя дэпутаты — члены Камісіі па эканамічнай рэформе, сабраўшыся на сваё чарговае пасяджэнне, галоўную ўвагу ўдзялілі падрыхтоўцы праектаў Законаў «Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь» і «Аб імянных прыватызацыйных чэкавых кніжках у Рэспубліцы Беларусь». Як забяспечыць сацыяльную справядлівасць, каб бязвыплатна сваю долю дзяржаўнай уласнасці атрымалі не толькі члены працоўных калектываў прадпрыемстваў, а і прадстаўнікі сацыяльнай сферы — настаўнікі, урачы, працаўнікі культуры, навукі, а таксама ваеннаслужачыя, работнікі праваахоўных органаў і іншыя,—такая асноўная праблема, на якой акцэнтавалі ўвагу дэпутаты.

Якім павінен быць механізм рэалізацыі палажэнняў гэтых законаў? Як забяспечыць гарантыі кожнаму грамадзяніну, які атрымае чэкавую прыватызацыйную кніжку, распараджацца ёю як уласніку? Быць уласнікам — гэта значыць мець магчымасць па свайму жаданню замяніць яе на адпаведную суму акцый прадпрыемства і такім чынам стаць акцыянерам, каб атрымліваць дывідэнды, або рэалізаваць прыватызацыйную кніжку за грошы праз фондавую біржу, камерцыйны банк ці праз фонд прыватызацыі.

Гэтыя думкі выказалі старшыня камісіі Леанід Козік, намеснік старшыні Барыс Макейчанка, сакратар Вінтар Аламліеў, члены камісіі Міхаіл Балоцін, Уладзімір Цялежнікаў, Павел Шкапіч, Генадзь Нікіцін.

Але госляды членаў камісіі разышліся з думкамі прадстаўнікоў Камітэта па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю, якія, як і раней, выказваліся за тое, каб рух чэкавых прыватызацыйных кніжак адбываўся толькі праз Фонд прыватызацыі. Калі згадзіцца з такім падыходам, дык грамадзянін, які не хоча быць акцыянерам (напрыклад, пенсіянер), а жадае прадаць сваю чэкавую прыватызацыйную кніжку, павінен многія гады чакаць, калі Фонд прыватызацыі будзе мець сродкі, каб выкупіць яе ў яго. Дэпутаты адзначылі, што нельга дапусціць падыходы, пры якіх людзі не маглі б рэалізаваць свае правы.

У. СТАЎСКІ,
загадчык сектара па пытаннях эканамічнай рэформы, плана і бюджэту Сакратарыята Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Лес мой—лёс мой

Вы толькі прыслухайцеся да імёнаў налібоцкіх рачулак: Сівічанка, Каменка, Волка. Вымаўляеш — нібы п'еш сівізну туманаў на паплавах, нібы ідзеш басанож па каменьчыках да крынічкі, нібы цікуеш за шэрым лясным гулякам у сховах старога ельніку.

Тут стогадовыя дрэвы сыходзяцца вершалінамі ў небе, а карэннямі сваімі сплятаюцца ў глыбінях зямлі. Ці не гэтак жа і людзі, што жывуць на аддаленых хутарах? Родныя іх гэта зямля, пушча, блакітныя нябёсы над галавой.

— Фермер я заможны, дваццаць тысяч гектараў маю, — жартам прадстаўляе сваю лясную гаспадарку егер Леанід Робертавіч Юрэвіч.

— Служба ў мяне дзяржаўная, а хата лясная. Два кані маю — бензінавага і сапраўднага, мышуасці на падворку ўдосталь, пчолы за пуняй гудуць. Даглядаю свой зялёны аб'ект, а калі трэба — па радыётэлефоне дакладваю начальству.

— Ну, вы сапраўды, нібы той замежны фермер, нават радыёсувязь уласная, — падладжваюся да гаварнога субяседніка.

— А што, па-вашаму, «замежны»? Вы ўяўляеце, што яны там хлеб з двух баноў маслам мажуць? Быў я нядаўна са сваім начальствам на Нямеччыне, службовую камандзіроўку меў. Сам пабачыў, як там людзі такой жа справай займаюцца. Ім таксама шчыраваць даводзіцца, бо чалавек у лесе паўсюдна патрэбен. Трэба ж кармусьці гэта жывое хараство абараняць. У адным толькі я пазайздросціў немцам. У іх закон забаранае курыць у лесе. Вось гэта закон! Вось гэта парадак!

Слухаеш Леаніда Робертавіча — не наслухаешся. Усё ў яго простае, зразумелае: і думкі і словы. На гэтай зямлі ён рос, тут набіраўся жыццёвай мудрасці. Сорак пяць гадоў у лесе працуе. Няхай толькі не здаецца вам, што слова «працуе» не стасуецца з «курортным» месцам жыхарства і службай. Ен егер, а гэта значыць, што вядомыя яму не толькі зялёныя сцежкі звяроў, але і крывавыя сляды браканьераў. Іншы на такой службе даўно б ужо надбаўку запрасіў за небяспеку. Ды і сама пушча вакол хаты не заўжды такая ласкавая, як у гэтым цёплым чэрвеньскім дні. Увосень тут ліўні сякуць па вокнах, узімку стынуць гурбы снегу пад сценамі...

— Я вам так скажу, — падсумаваў свой расказ Леанід Робертавіч.—Галоўнае ў любой працы, каб яна на табе не абарвалася. Сыны мае ў горадзе жывуць, бацькаву справу ім ужо не падтрымаць. У мясцовым паляўнічым заказніку людзей маладых таксама няшмат. Так што, хоць працуецца з душой, але на той жа самай душы неспажойна. Хіба вось унучак Антосік падрасце і дзедава месца зойме. Можа дачакаюся, а?

Яўген ПЯСЕЦКІ.
(Валожынскі раён).

Выступленне

Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. Ф. Кебіча на 79-й сесіі Міжнароднай канферэнцыі працы

Пан Старшыня!
Паважаныя дамы і панове!

Мне аказана вялікі гонар прадстаўляць з гэтай высокай трыбуны 79-й сесіі Міжнароднай канферэнцыі працы маю краіну, новую суверэнную дзяржаву — Рэспубліку Беларусь, якая выбрала дэмакратычны шлях развіцця. Тым больш, што амаль за саракагадовы перыяд удзелу Беларусі ў дзейнасці МАП кіраўнік урада рэспублікі выступае з гэтай трыбуны ўпершыню. Дзякую Вам, пан Старшыня.

Дазвольце павіншаваць вас, пан Старшыня, віцэ-старшыняў з выбраннем на адказныя пасады.

Упэўнены, што ваша майстэрства дыпламатыі і прафесіяналізм дапамогуць знайсці неабходныя кампрамісы і паспяхова завяршыць работу сесіі.

Асабліва хацелася б выдзеліць актуальнасць і значнасць дакладаў «Дэмакратызацыя і МАП», а таксама «Адаптацыя і развіццё людскіх рэсурсаў». Яны вызначаюцца не толькі важнасцю праблем, але і філасофскай глыбінёй іх асэнсавання і вывадамі. Мы, як і Вы, пан Генеральны дырэктар, іменна з дэмакратыяй звязваем прагрэс нашай краіны, рэалізацыю надзей майго народа на лепшую будучыню.

Дазвольце, пан Генеральны дырэктар, павіншаваць вас з дасягнутымі поспехамі.

Цяперашняя сесія праходзіць у перыяд, які несумненна ўвойдзе ў гісторыю чалавецтва як эпоха ліквідацыі таталітарных рэжымаў, спынення халоднай вайны і канфрантацыі, набыцця многімі краінамі суверэнітэту, свабоды і незалежнасці.

Два гады назад Рэспубліка Беларусь дэкларавала свой дзяржаўны суверэнітэт. Да яго беларускі народ прыйшоў рэдкім па трагізму гістарычным шляхам. На працягу стагоддзяў мая радзіма, ні на каго не нападаючы, але, знаходзячыся на геаграфічным і гістарычным раздарожжы, нярэдка станавілася арэнай спусташальных ваенных сутыкненняў. Вось чаму ў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце дакладна сфармулявана мэта: зрабіць рэспубліку нейтральнай дзяржавай, а яе тэрыторыю — бяз'ядзернай зонай. І да гэтай мэты мы ідзём няўхільна.

Становячыся на шлях самастойнага развіцця, мы пацвердзілі сваю прыхільнасць да прынцыпаў Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і іншых міжнародных актаў, якія закранаюць грамадзянскія, палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя і культурныя правы.

Далучэнне рэспублікі да агульнаеўрапейскага працэсу мы расцэньваем як важнейшы этап нашага вяртання ў сям'ю еўрапейскіх народаў.

Паважаныя дамы і панове!

Парламент і ўрад Рэспублікі Беларусь зыходзяць з таго, што базісная асновай дэмакратыі і дэмакратызацыі з'яўляецца рыначная эканоміка, не сумяшчальная з каманднымі метадамі кіравання. І на гэты шлях мы сталі цвёрда і паслядоўна. Ужо створаны зыходныя прававыя і арганізацыйныя асновы сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі. Прыняты адпаведныя законы. Паслядоўна рэалізуецца ідэя прававой дзяржавы, падзелу ўлад і ўдасканалення выканаўчых органаў.

Павінен адзначыць, што ў нас, як і ў іншых краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, пераход да рынку ідзе вельмі складана і супярэчліва. Найбольшыя цяжкасці ўзнікаюць пры правядзенні прыватызацыі, барацьбы з манапалізмам, стабілізацыі грашова-фінансавай сістэмы. Многа праблем звязана з тым, што рубель пакуль што застаецца неканверсуемым, пры гэтым штучна створаны дэфіцыт грашовай масы, вялікі ўнутраны і знешні дзяржаўны доўг, які правакуе дэфіцыт бюджэту і інфляцыю.

Наша становішча ўскладняецца яшчэ і тым, што мы засталіся па сутнасці адзін на адзін з ліквідацыяй вынікаў аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі, а таксама атрыманай у спадчыну ад мінулага часу структурай народнай гаспадаркі з празмерна высокай доляй галін ваенна-прамысловага комплексу.

Тым не менш урад мае як доўгатэрміновую, так і кароткатэрміновую праграмы выхаду з крызісу.

У рамках кароткатэрміновай праграмы мы маем намер у самы бліжэйшы час пры дапамозе ўдасканалення гаспадарчых сувязей, матывацыйнага механізма, канверсіі, умацавання грашовай адзінкі, ва ўзаемадзеянні з зарубежнымі партнёрамі пераадолець спад вытворчасці.

У рамках доўгатэрміновай перспектывы прадугледжваецца ажыццявіць структурную перабудову нашай эканомікі з інтэграцыяй яе ў сусветную сістэму, правесці прыватызацыю, надаць цывілізаваныя формы і істотна расшырыць сферу прадпрымальніцкай дзейнасці і забяспечыць павышэнне ўзроўню жыцця народа.

Адна з найбольш складаных задач у рэалізацыі ўказаных праграм — дабіцца іх падтрымкі народам на аснове кампрамісаў і згоды розных палітычных плыняў і партый. Пры гэтым трэба пераадолець псіхалогію ўраўняльнасці, якая культывавалася гадамі, бо і да гэтага часу амаль палавіна даходаў нашых людзей фарміруецца незалежна ад канкрэтных вынікаў працы.

Вось чаму праблему карэннага ўдасканалення размеркавальных адносін урад Беларусі лічыў і лічыць адной з найбольш важных. Тут мы паслядоўна вырашаем тры ўзаемазвязаныя задачы.

Па-першае, радыкальна рэфармуем аплату працы, адмовіўшыся ад цэнтралізаванага ўстанаўлення размераў і ўзроўняў аплаты, перадаўшы вырашэнне гэтых пытанняў самім прадпрыемствам у асобе прадстаўнікоў працоўных і работадаўцаў. Але наша дзяржава патрабуе ад работадаўцаў, і гэта замацавана заканадаўствам, захавання гарантаванага мінімуму аплаты працы, роўнай аплаты за роўную працу, стварэння і захавання належных умоў і працятлівасці працы.

Па-другое, ажыццяўленне рэфармацыі ўсёй сферы сацыяльных паслуг і механізмаў іх забеспячэння шляхам прадастаўлення ўсіх гэтых паслуг не па прынцыпу ўраўняльнага размеркавання, а ў прамой залежнасці ад асабістага працоўнага ўдзелу. Тым самым мы імкнёмся пакончыць з сацыяльным паразітызмам і забяспечыць сацыяльную справядлівасць.

Па-трэцяе, урад добра разумее, што, нягледзячы на ўсе цяжкасці, мы не можам ігнараваць сацыяльную абарону найбольш неабароненых груп насельніцтва (беспрацоўныя, жанчыны, моладзь, асобы пажылога ўзросту, непрацаздольныя), паколькі тут на карту ставяцца мэты і сэнс дэмакратыі.

Гэта патрабуе прынцыповай перабудовы ўсёй сістэмы сацыяльнага забеспячэння і страхавання. Першыя крокі ў гэтым напрамку ўжо зроблены. Функцыяніруе служба занятасці. Створаны Пенсіённы фонд. Праводзяцца трохбаковыя кансультацыі, хоць станаўленне сацыяльнага партнёрства толькі-толькі зараджаецца. У цэлым урад рэспублікі імкнецца вырашаць найбольш вострыя праблемы, якія закранаюць інтарэсы большасці насельніцтва рэспублікі, на аснове дыялога. Гэта ў вядомай ступені садзейнічае таму, што сёння абстаноўка ў нас найбольш стабільная і трывалая ва ўсіх адносінах.

Разам з рэфармаваннем размеркавальных адносін і ў мэтах іх замацавання нам неабходна сфарміраваць зусім новыя інстытуцыйныя структуры. Мы маем намер узмацніць ролю дзяржавы ў правядзенні палітыкі сацыяльнага страхавання на трохбаковай аснове. Мы спадзяёмся на дапамогу і падтрымку МАП у рэалізацыі ўсіх гэтых вельмі актуальных задач.

Ужо можна з задавальненнем канстатаваць, што ўзровень нашых адносін з МАП значна ўзбагаціўся. І я хачу яшчэ раз пацвердзіць, што Рэспубліка Беларусь будзе шырока прымяняць каштоўны для нас вопыт гэтай міжнароднай арганізацыі.

У сувязі з гэтым я хацеў бы выказаць меркаванне, а, магчыма, нават просьбу такога парадку. Паколькі спецыяльная сесія Савета кіраўнікоў Праграмы развіцця ААН прыняла рашэнне аб пераводзе Рэспублікі Беларусь з разраду краін-донараў у разрад краін-атрымальніц тэхнічнай дапамогі ААН, то для нас было б вельмі карысным, каб МАП палічыла магчымым аказаць нам канкрэтную дапамогу ў рэалізацыі комплексу сумесных праектаў па ажыццяўленню эканамічных рэформ у рэспубліцы.

Пан Старшыня! Высокая ўспрымальнасць Міжнароднай арганізацыі працы да палітычных і эканамічных змяненняў, якія адбываюцца ў свеце, дазваляе МАП пастаянна ўдасканальваць сваю дзейнасць, распрацоўваць новыя канструктыўныя ініцыятывы і тым самым выступаць магутнай прыцягальнай сілай для краін і народаў. Я хацеў бы ў сувязі з гэтым павіншаваць дэлегацыі ўсіх краін, якія сталі новымі членамі МАП.

У заключэнне, пан Старшыня, я хацеў бы яшчэ раз выказаць поўную сваю павагу да Міжнароднай арганізацыі працы і пацвердзіць нашу гатоўнасць рабіць усё неабходнае для развіцця канструктыўнага супрацоўніцтва з гэтай арганізацыяй.

Дзякую за ўвагу.

Жэнева, 17 чэрвеня 1992 г.

РАЯЦЦА ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ

ГРОДНА (Б. Пракопчык). З 16 па 19 чэрвеня тут праходзіла сустрэча банкаўскіх і біржавых дзеячаў Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Таджыкістана, Кыргызстана і Польшчы, арганізаваная Саюзам прадпрымальнікаў нашай рэспублікі. Абмяркоўваліся ўмовы і меры стымулявання дзелавой актыўнасці прадпрымальніцкіх структур, фарміравання адзінай дзелавой прасторы, супрацоўніцтва банкаў і біржаў краін СНД са сваімі партнёрамі ў Прыбалтыцы і Польшчы. У гэтых мэтах удзельнікі сустрэчы выказаліся за збліжэнне нарматыўна-заканадаўчых актаў дзяржаў Садружнасці. У сферы біржавай дзейнасці прызнана перспектыўным аб'яднанне і спецыялізацыя біржаў, рэкамендавана ў кожнай дзяржаве стварыць адну моцную, універсальную і сетку спецыялізаваных біржаў, арыентаваных на рэалізацыю прадукцыі, якая вырабляецца ў гэтым рэгіёне.

Сустрэча пацвердзіла намер дзелавых колаў праводзіць актыўнае лабіраванне заканадаўчай улады, іх жаданне супрацоўнічаць з урадамі на раўнапраўнай аснове.

ВАШЫ НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ
● камп'ютэры PC AT (286/287. 1.40, SEGA, 1.2, 360, mouse)
● камп'ютэры PC XT (88/87, 640, 32, SEGA, 2×360)
● прынтэры HYUNDAI, MICROLINE (фармат А3)
● бухгалтарскія калькулятары CASIO HR-120T (12 разрадаў, друк — двухколерны)
● тэлефаксы, ксераксы, плотэры
● картрыджы для прынтэраў EPSON, SEIKOSHA
(ЦЭНЫ ЗНІЖАНЫ НА 30 ПРАЦЭНТАЎ)
Daino Dainova D Dain Dainova
(0172) 217-408

ПАКУЛЬ СМАЖАНЫ ПЕВЕНЬ НЕ КЛЮНЕ?

КОБРЫН. У пажарным парадку адзін з дапаможных цэхаў калгаса «Новы шлях» выконвае заказ на прыстасаванні сігналізацыі супраць угону калгаснай тэхнікі.

А паступіў заказ пасля таго, як у адну з начэй ад дома галоўнага інжынера гаспадаркі быў выкрадзены калгасны УАЗ-452...

БОЛЬШ ЭРАТЫЧНЫХ ФІЛЬМАЎ—МЕНШЫ ДЭФІЦЫТ БЮДЖЭТУ

МІНСК. На сесіі гарадскога Савета народных дэпутатаў начальнік фінансавага ўпраўлення Мінгарвыканкома Л. Якавенка паведаміла дэпутатам, што дэфіцыт гарадскога бюджэту зараз складае ні многа ні мала 400 мільёнаў рублёў.

Далей дэпутаты абмяркоўвалі мясцовыя падаткі і зборы. Так, плануецца ўвесці збор за прадастаўленне права гандлю і абмену тавараў на рэчавых рынках сталіцы Беларусі ў размеры 20 рублёў з фізічных і юрыдычных асоб, за паслугі ў гасцініцах і рэстаранах вышэйшага разраду — 5 працэнтаў ад сумы аказваемых паслуг, за карыстанне ўсялякага роду павільёнамі, кіёскамі, гандлёвымі памяшканнямі і г. д. — 1.000 рублёў у месяц. А вось за паказ эратычных фільмаў трэба будзе пазбавіцца 10 працэнтаў прыбытку.

● ПРАДПРЫМАЛЬНІК І ДЗЯРЖАВА

Прырода чакае... спонсара?

Абрэвіятура, з якой складаецца назва малога прадпрыемства «АСПЭК», расшыфроўваецца так: аўтаматызаваныя сістэмы, прыборы экалагічнага кантролю. Калі МП толькі стваралася, яго дырэктар, кандыдат фізіка-матэматычных навук І. ГУРСКІ спадзяваўся: цяпер ужо, свабодны ў сваіх дзеяннях, ён праз прадпрымальніцкія структуры хутка арганізуе вытворчасць прыбораў, вельмі патрэбных нашай хворай экалогіі. Аказалася, аднак, што многага ён не прадбачыў...

З чым жа сутыкнуўся бізнесмен-вучоны — фігура, дарэчы, зусім новая для нашага грамадства?

Многія, напэўна, памятаюць, колькі шуму ў свой час нарабіла гісторыя са скурзаводам, пабудаваным з дапамогай італьянцаў у Гатаве, што пад Мінскам. З-за дрэннай ачышчальнай сістэмы яго ўсур'ёз думалі закрываць.

Наша МП прапанавала кіраўніцтву прадпрыемства ўкараніць у вытворчасць флуарыметр для экспрэснага аналізу ўтрымання ў сцёкава-тэхнічных водах нафтапрадуктаў і паверхнева-актыўных рэчываў. Дарэчы, аналагаў гэтаму прыбору ў краінах СНД на сённяшні дзень няма. Якім жа быў адказ?

— Згодны, што распрацоўка цікавая і перспектыўная. Дагавор, аднак, заключыць не можам — няма свабодных сродкаў.

Нешта падобнае атрымалася і ў час кантактаў з Мінскім заводам халадзільнікаў, якому мы прапанавалі абзавесціся сістэмай аўтаматычнага кантролю стану вытворчых сцёкаў, пабудаванай на дысплеях, датчыках, ЭВМ. Зноў жа: няма грошай, сядзім на картатэцы. І — заўвага ўжо ў наш адрас (дарэчы, справядлівая): апаратура не атэставаная беларускім Дзяржстандартам, значыць, прымяняць яе пакуль нельга.

Усё гэта так. Але, з іншага боку, як тады працуе заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя, у якім прадугледжаны штрафныя санкцыі да прадпрыемстваў, што забруджваюць прыроду? Каб закон сапраўды стаў дзеючым, хутка рэагуючым, адпаведным экалагічным службам неабходна мець сучасную кантрольную апаратуру. Тады можна было б імгненна вызначаць выпадкі забруджвання асяроддзя і караць вінаватых. Упэўнены: на заводах адразу з'явіліся б і сродкі, і яны паспяшаліся б заказаць прыборы кантролю. Пакуль жа за гэта галава ў іх не баліць. А ў дзяржавы?

...Роздум над гэтай праблемай вымагае ўспомніць і пра асабісты вопыт. Больш як дваццаць гадоў я прапрацаваў у Інстытуце фізікі АН Беларусі, займаўся ў асноўным распрацоўкай гідрааптычнай апаратуры для даследавання воднага асяроддзя — азёр, рэк, мораў. Атрымлівалася так, што апараты вырабляліся для патрэб тагачаснага саюзнага Інстытута акіяналогіі, большасць жа распрацовак асядала, як кажуць, на паліцах.

Але ж трэба нешта вынаходзіць і для беларускіх умоў! Пачатак быў зроблены, калі з'явілася цэлая серыя прыбораў. Можна было вымяраць ужо не толькі ўзровень забруджанасці вады, але і тэмпературу, мінералізацыю, электраправоднасць. А потым — і ўтрыманне хларафілу, растворанай арганікі, што вельмі важна для рыбнай гаспадаркі, працы біёлагаў і гідрабіёлагаў. Але як паставіць вытворчасць апаратаў на паток, дзе ўзяць на гэта грошы, калі дзяржава стала фінансаваць навуку вельмі слаба? Тады і вырашылі адысці ад афіцыяльных структур, заняцца прадпрымальніцтвам, каб пры дапамозе ўласнай энергіі, творчага патэнцыялу вырашыць важную для народнай гаспадаркі праблему.

На пачатку леташняга года заснавальнік «АСПЭК» заключыў з адной з ленінградскіх навучальных устаноў дагавор на ўкараненне вымяральнага комплексу. Толькі зрабілі трэцюю частку работы, як інстытут паведаміў, што спыняе фінансаванне — эканамічны крызіс «уступіў у свае правы». Вось тады МП і пачало «круціцца», знаходзіць у Беларусі заказы нават і не па свайму профілю, каб толькі зарабіць сродкі. Фірму на плаву ўтрымалі, але пра развіццё базы па вытворчасці экалагічных прыбораў не было чаго і думаць. Нават доследныя ўзоры засталіся ў заказчыкаў, бо былі выраблены на іх грошы.

У дадатак — праблема атэстацыі новай тэхнікі. Яшчэ мінулым летам «вынаходнікі» з тагачаснага Дзяржстандарту СССР прапанавалі такія падыходы: плаціце грошы — атэстуем вашы вырабы. Каштавала такая «паслуга» ў той час каля 40 тысяч рублёў, а дзе ж іх было ўзяць, калі заказы, зробленыя нам, былі сарваны? Улічваючы астранамічны рост цэн на ўсё і ўся, можна толькі меркаваць, колькі запросяць з нас у беларускіх службах стандартызацыі. Як вам, паважаныя спадары, падабаецца такая сітуацыя? Дзяржаве, яе эканоміцы як паветра патрэбны прыборы для сучасных метадаў экалагічнага кантролю, але, каб наладзіць агульнакарысную справу, прадпрымальнік павінен вылажыць яшчэ і кругленькую суму. Ці не абсурд?

Да каго яшчэ звяртацца, каб пасадзейнічалі? Вядома, у Беларускі экалагічны саюз. Але і там чуем знаёмае:

— Прыборы вашы добрыя, але яны не атэставаныя. Вырашыце гэту задачу — і мы зможам рэкамендаваць іх прадпрыемствам.

Зачараванае кола дый годзе!

А пакуль толькі і радасці, што праспекты, выпушчаныя МП «АСПЭК», на ўсялякіх выстаўках разбіраюць вельмі хутка. Ходзяць чуткі, што кітайскія спецыялісты, якія месяц назад наведалі Акадэмію навук Беларусі і станоўча адазваліся аб нашай апаратуры, маюць намер абгаварыць у будучым магчымасць заказаў на яе пастаўкі. Магчыма і іншае развіццё падзей: падобныя прыборы, але ўжо не з нашымі патэнтамі, з'явяцца ў іншых краінах, а мы потым будзем, як і заўсёды, купляць іх за валюту. Такія ўжо мы «рыначнікі»...

Ігар ГУРСКІ.

г. Мінск.

З розных гарадоў і вёсак рэспублікі трапляюць пацыенты ў Мінскі дыягнастычны цэнтр. Сучасная апаратура, новыя метады даследаванняў, выдатныя спецыялісты гарантуюць хуткі і якасны дыягназ. Клініка-дыягнастычная лабараторыя, напрыклад, штодзённа выконвае да трох тысяч даследаванняў, кожнае з іх можа быць рашаючым у вызначэнні метаду лячэння.

Мінскі цэнтр стаў своеасаблівай школай перадавога вопыту для медыкаў многіх медыцынскіх устаноў Беларусі. Прыязджаюць сюды за ведамі і ўрачы з краін Садружнасці.

НА ЗДЫМКАХ: загадчык аддзялення функцыянальных метадаў даследаванняў Т. ПІМЕНАВА і ўрач В. ТРАФІМЕНКА; падрыхтоўка да даследаванняў пры дапамозе камп'ютэрнага тамографа. Каля хворага — рэнтгенэператар С. ШАУЛЯКОВА.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

● ІНВЕСТЫЦЫІ І ЭКАЛОГІЯ: ГРОШАЙ ПАКУЛЬ НЯМА

● ПРАДПРЫМАЛЬНІКУ ПАТРЭБЕН ДОБРЫ АДВАКАТ

● АБЛІГАЦЫІ НА РЫНКУ — СПРАВА НАДЗЕЙНАЯ

● БІРЖАВІКІ ЗНАХОДЗЯЦЬ ВЫЙСЦЕ

● КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ

Рубрыку вядзе Аляксандр БУРДА, брокер фірмы «Аліна»

Аблігацыі

Слова «аблігацыі» выклікае не самыя прыемныя пачуцці. Усе мы добра ведаем, што аблігацыі дзяржаўнай пазыкі СССР пасля распаду Саюза былі замарожаны. Цяпер іх абяцаюць абмяняць на беларускія аблігацыі, але калі можна будзе атрымаць «жывыя» грошы — невядома. Так, наша дзяржава абанкруцілася, але гэта не азначае, што любыя аблігацыі нікуды не вартыя. Больш таго, калі аблігацыі выпушчаны надзейным эмітэнтам, ды яшчэ пад гарантыі банка, — з імі мець справу не горш, чым з акцыямі, а то нават і лепш. Аблігацыя — гэта каштоўная паперa, якая пацвярджае абавязацельства эмітэнта (таго, хто выпусціў яе) вярнуць грошы, атрыманыя ім ад інвестара (пакупніка аблігацыі) ва ўказаны тэрмін і з пэўнымі працэнтамі. Інакш кажучы, аблігацыя — гэта фактычна даўгавая распіска. У адрозненне ад акцыі, яна не дае права ўдзельнічаць у кіраванні прадпрыемствам. Затое аблігацыя гарантуе вяртанне грошай з цвёрдымі працэнтамі: нават калі прадпрыемства-эмітэнт разарыцца, грошы па аблігацыях павінны быць вернуты ў першую чаргу, а ўжо потым уладальнікі (або акцыянеры) падзеляць астатнюю маёмасць. Таму аблігацыі, як правіла, больш надзейныя за акцыі. Пры гэтым яны больш «прадказальныя» — даход па аблігацыях дакладна вызначаны, і таму іх цана не можа рэзка ўзрасці ці ўпасці, як гэта часта адбываецца з акцыямі. Па гэтай прычыне аблігацыі рэдка абарочваюцца на фондавай біржы: іх у асноўным купляюць для надзейнага захавання сродкаў і яны мала прыгодныя для біржавой гульні.

Існуюць працэнтныя і беспрацэнтныя аблігацыі. Па першых працэнт выплачваецца або разам з асноўным коштам аблігацыі (напрыклад, аблігацыя наміналам 1.000 рублёў і 20 працэнтамі цераз год прымаецца эмітэнтам па 1.200 рублёў), або асобна. Выплаты могуць рабіцца па спецыяльных адрыўных частках аблігацыі — купонах. Дарэчы, адсюль паходзіць паняцце «стрыгчы купоны».

Іншы раз выпускаюцца беспрацэнтныя аблігацыі. Яны прадастаўляюць сваім трымальнікам пэўныя правы, напрыклад, аблігацыі Беларускай біржы будматэрыялаў даюць права адкрыцця брокерскага месца. Часцей за ўсё беспрацэнтныя аблігацыі адразу прадаюцца з дысконтам, гэта значыць ніжэй за намінал. Напрыклад, аблігацыя наміналам 1.000 рублёў прадаецца эмітэнтам па 800. Цераз год яе можна вярнуць і атрымаць намінал, г. зн. 1.000. Значыць, даход трымальніка складзе 200 рублёў, або 25 працэнтаў.

У Беларусі пакуль што ў якасці адзінага прыкладу недзяржаўных аблігацый, разлічаных на грамадзян, — можна прывесці аблігацыі народнай карпарацыі «Грамада» наміналам 1.000 рублёў з 25-працэнтнай стаўкай. Сродкі, атрыманыя ад продажу аблігацый, карпарацыя накіроўвае на розныя камерцыйныя праекты. Акрамя таго, яна будзе ажыццяўляць імпарт і вытворчасць медыцынскіх прэпаратаў і абсталявання, радыяцыйна чыстых прадуктаў у рамках праграмы ліквідацыі вынікаў Чарнобыля. Гарантыяй вяртання грошай з працэнтамі служыць размяшчэнне сродкаў да іх камерцыйнага выкарыстання на дэпазітныя ўклады ў «Прамбудбанку» і «Прыорбанку».

А ў заключэнне нагадаю: брокерская фірма «Аліна» праводзіць усе віды аперацый з каштоўнымі паперамі і валютай, вы можаце пракансультавацца і па іншых аперацыях. Тэл. 64-16-30.

● КАМЕРЦЫЯ І ПРАВА

«Абаронцам у крымінальных справах не выступаю. Не хапае сіл...»

Усё грамадства сёння наракае на прававое бязладдзе. У тым ліку — у сферы эканомікі, прыватнага бізнесу. Праваахоўныя органы, падатковая інспекцыя скардзяцца на парушэнні заканадаўства з боку прадпрымальнікаў. Апошнія ж, у сваю чаргу, незадаволены сутнасцю новых эканоміка-прававых нормаў, падыходамі да іх тлумачэння з боку мясцовых уладаў.

У даным выпадку, думаецца, будзе цікавым пункт погляду спецыяліста, які ў адной асобе спалучае і прадпрымальніка, і юрыста. Даём слова дырэктару Беларускага камерцыйна-юрыдычнага цэнтра «Камюрсервіс» Аляксандру СІНЯКУ.

— Наколькі мне вядома, некалькі гадоў назад вы стварылі адзін з першых у Беларусі юрыдычных кааператываў, які, на жаль, у выніку заціску кааператыўнага руху праіснаваў толькі год. Сам факт з'яўлення такога, вобразна кажучы, «тытула» (пракурор-прадпрымальнік) — з'ява неардынарная. Аляксандр Васільевіч, можа б вы больш поўна расказалі пра сябе, пра тое, што вас падштурхнула на такі рашучы крок?

— Пачну з таго, што заўважу: нічога экстраардынарнага ў сваім лёсе, не бачу. У свой час амаль 18 гадоў я адпрацаваў у органах пракуратуры. Можаце паверыць, дастаткова нагледзеўся, з якімі перакосамі працуе наша праваахоўная сістэма. Што можна было процідаставіць гэтай машыне, у многім створанай яшчэ ў сталінскія часы? У гады перабудовы гэтыя структуры таксама не думалі мяняцца. Цярпенне, што называецца, лопнула, і я выйшаў з іх радоў: у 1989 годзе стварыў кааператыў «Законнасць».

Ніякага асаблівага бізнесу я не зрабіў, ды і не той гэта шлях, на якім можна атрымаць вялікія дывідэнды. Не буду ўдавацца ва ўспаміны, але ж гэта факт: мне сем месяцаў спатрэбілася толькі на тое, каб «прабіць» сваю справу — мясцовыя ўлады супраціўляліся гэтаму ўсімі сіламі.

— Наколькі я разумею, вы раней за многіх іншых убачылі, што тагачасныя гучныя тырады аб стварэнні прававой дзяржавы заставаліся толькі размовамі, і не больш.

— Гэта было відаць яшчэ з заканадаўства перабудовачных часоў былога Саюза ССР. У першым Законе «Аб кааперацыі» была закладзена па-рыначнаму цывілізаваная думка: стаўкі падаткаў не мяняць 5 гадоў. Праз год, як мы ведаем, пачалася чахарда, якая закранула і Беларусь: узровень падаткаў мяняўся, што называецца, тройчы «за сезон». Ды і сённяшняе наша падатковае заканадаўства са сваёй канфіскацыйнай накіраванасцю душыць прадпрымальніцтва, не дае развівацца калектывам усіх формаў уласнасці.

Як выжыць у такіх умовах? Мы пайшлі на стварэнне камерцыйна-юрыдычнага цэнтра, які мае статус шматпрофільнага малога прадпрыемства і ўваходзіць у сістэму Беларускага таварыства інвалідаў. Гэта тым больш важна, што інваліды сёння наогул маюць вялікую патрэбу ў абароне сваіх правоў, а тыя з іх, хто заняўся бізнесам, арганізаваў уласную справу, — удвая. Такое спалучэнне — камерцыйная дзейнасць, вытворчасць тавараў народнага спажывання плюс юрыдычная абарона ад самавольства тых, хто мае ўладу, — і дазваляе трымацца на плаву.

— Тут я з вамі згодзен, прыкладаў самавольства хапае: калі мясцовая ўлада хоча прыціснуць прадпрымальніка, то не глядзіць, інвалід ты ці не. Ёсць выпадкі, калі ў адносінах да найбольш самастойных, упартых бізнесменаў наладжваецца нават крымінальнае праследаванне. Зачэпку пры вольнай трактоўцы закона заўсёды можна знайсці...

— Аднак спецыяльнага пункта аб удзеле ў якасці абаронцы ў крымінальным і грамадзянскім судаводстве ў статут МП мы не ўключылі. Скажу шчыра: усіх, каго незаконна праследуюць, мы абараніць проста не ў стане. Інакш, узяўшыся за справу, як потым глядзець людзям у вочы? Судовыя ж працэсы цягнуцца гадамі, праваахоўная сістэма ў сферы эканомікі, прыватнага бізнесу працуе на халастых абаротах. Ці можна нам браць на плечы непад'ёмны цяжар? А таму — падобнымі справамі няхай займаюцца народныя суды, адвакатура, наогул, тыя арганізацыі, якім і належыць гэта рабіць.

У «Камюрсервіса» — іншае поле дзейнасці. Гэта — усялякія юрыдычныя кансультацыі, распрацоўка дакументацыі для заснавання прыватных прадпрыемстваў і многае іншае. Наш клопат сёння — пастаяннае кансультаванне і «радавых» бізнесменаў, і кіраўнікоў МП, іншых рыначных структур, каб, не дай Бог, яны не парушылі нашых даволі-такі блытаных законаў, не далі падставы для новых прыдзірак. Трэба было б наладзіць усеагульнае навучанне нашых дзелавых людзей з тым, каб яны маглі адстойваць свае правы і ў бізнесе, і ў сацыяльных пытаннях, умелі абараняць сваю годнасць і гонар.

— Да ідэалу ў гэтым плане нам яшчэ, зразумела, вельмі далёка. Па ўсім відаць, што работы ў вас больш чым дастаткова.

— Здалося б дзіўным, калі б у сённяшніх умовах ды было наадварот. Калі гаварыць аб прынцыповых падыходах да падаткаабкладання прадпрыемстваў сістэмы таварыства інвалідаў, то інакш як непрадуманымі, негуманнымі іх не назавеш. Але яшчэ больш «пагаспадарску» ставяцца да нашых прадпрымальнікаў органы мясцовых уладаў. Выканкомы, напрыклад, паімкнуліся незаконна спаганяць з іх страхавыя плацяжы ў Пенсійны фонд. Захацелася за кошт МП, дзе працуюць інваліды, паправіць свае фінансавыя справы — пачалі спаганяць падатак з прыбытку. Рабілі гэта настолькі нахабна, што нават не зважалі на Закон «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў», дзе сказана аб вызваленні такіх прадпрыемстваў ад гэтага падатку да 1 студзеня 1996 года.

А паборы за рэгістрацыю прыватнага прадпрыемства ці МП? Дзяржаўнымі органамі вызначана, што з нашых прадпрымальнікаў за гэта можна браць не больш як 300 рублёў, а ў мясцовых Саветах увялі незаконную абдзіралаўку па 1.300—2.000 рублёў. Пасля ж умяшання Саўміна рэспублікі (дарэчы, пасля нашых патрабаванняў) гэтыя «фінансісты» пачалі каяцца: маўляў, чорт спакусіў. Уласнай кішэняй, заўважце, ніхто не адказаў.

Так што адрасоў для скаргаў, пісьмаў, юрыдычных абгрунтаванняў у нас хапае. Спецыялістам «Камюрсервіса» лепавацца не прыходзіцца.

— Карціну, Аляксандр Васільевіч, вы намалявалі, прама скажам, несуцяшальную. Калі і па ўсёй рэспубліцы такі стан спраў, то можна толькі гадаць, колькі кваліфікаваных юрыстаў спатрэбіцца, каб у нас з'явіўся хоць адносны парадак.

— А навошта гадаць? Трэба столькі, колькі «праглыне» рынак. Ці не зразумела, што без нармальнага прававога забеспячэння эканоміка як след функцыяніраваць не будзе? А кадраў, тут вы маеце рацыю, практычна няма. Асабліва, я назваў бы іх так, юрыстаў-камерсантаў. Цяпер Саюз юрыстаў Рэспублікі Беларусь арганізоўвае сваю сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў (невядома толькі, хто будзе іх атэстоўваць і выдаваць дыпломы?). Гэтым жа займуцца і новыя структуры пры Саўміне. А вось Белдзяржуніверсітэту ў гэтым плане трэба поўнасцю перабудавацца. Наогул, неабходна новая дзяржаўная сістэма падрыхтоўкі прававедаў. Рынак патрабуе ад нас дасведчанасці ва ўсім.

Запісаў Валерый ЧАРНЯЎСКІ.

● СІТУАЦЫЯ

Закруцілі біржам гайкі

Акцыянернае таварыства «Бабруйская біржа» па рашэнню акцыянераў пераўтворана ў акцыянернае таварыства «Бабруйскі гандлёва-прамысловы дом» (БГПД). А дзеля чаго?

Старшыня савета АТ Аляксандр Баркоўскі адкрыта гаворыць, што змяніць шыльду іх падштурхнула прыняцце Закона РБ «Аб таварных біржах». Закон гэты ён лічыць прыдатным для біржы класічнага ўзору заходняга тыпу, але не для нашых умоў пераходу да рынку. Многія яго палажэнні не даюць магчымасці дасягнуць мэт, дзеля якіх і стваралася «Бабруйская біржа». Напомнім, што яе заснавалі асноўныя вытворцы прамысловай прадукцыі горада на Бярэзіне і навакольнага рэгіёна пры ўдзеле і падтрымцы мясцовых улад менавіта для таго, каб наладзіць эканамічныя сувязі паміж пастаўшчыкамі і спажыўцамі, знізіць пагрозу беспрацоўя.

Біржа адразу зрабіла ўражанне эфектным стартам, дакладнай арганізацыяй справы. Але ад многага, што яна напрацавала, чаму навучыла мясцовых бізнесменаў, неўзабаве прыйшлося адмаўляцца: новы закон аб біржах паставіў іх у такія ўмовы, што напружвацца на нашым псеўдарынку стала сабе даражэй.

Змяніўшы свой статус, акцыянернае таварыства не толькі нічога з ранейшых напрацовак не страціла, а, наадварот, рэзка расшырыла сферу дзейнасці. Як і раней, тут будуць праводзіцца рэгулярныя таргі па такіх пазіцыях, як тавары, паслугі, нерухомасць, каштоўныя паперы. БГПД займецца і арганізацыяй сваёй уласнай вытворчасці. І, вядома ж, аказаннем самых розных відаў паслуг — ад маркецінгавых да міжнароднага турызму. Так што мясцовы бізнес здавацца не збіраецца, калі, вядома, заканадаўчыя ўлады рэспублікі не дадумваюцца пайсці супраць усяго прадпрымальніцтва своеасаблівым «крыжовым паходам»...

Аляксандр САНЧУК.

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

ЦІ ПРАЦВЕРАЗЕЕ ГРАМАДСТВА?

Ёсць падзеі, гадавіны якіх не адзначаюць. Адна з такіх свядома забытых з'яў — чарговая гадавіна антыалкагольнай кампаніі. Здаецца, зусім нядаўна пад гукі фанфараў мы настойліва імкнуліся, згодна з антыалкагольным дэкрэтам, увесці цвярозы ўклад жыцця. Але каханне па прымусу — не што іншае, як згвалтаванне. І вось праз сем гадоў паспрабуем разабрацца: што прынёс грамадству і кожнаму з нас той паход супраць п'янства? І дапамагчы ў гэтым мы папрасілі першага намесніка міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь генерал-маёра міліцыі У. ДАНЬКО.

— У мяне на стале ляжыць апаратыўная зводка першых дзён чэрвеня, — гаворыць Уладзімір Антонавіч. — Чырвоным алоўкам падкрэслены звесткі аб злачынствах і здарэннях, дзе ў той ці іншай ступені «дзеючай асобай» выступае алкаголь. Як бачыце, чырвонага вельмі і вельмі многа. Чытаем: «У вёсцы Трацяковцы Ляхавіцкага раёна ў сваім доме інвалід 2-й групы сякерай забіў п'янага сына, які спаў. Ён нідзе не працаваў, неаднаразова пагражаў яму забойствам». «У Мінску, таксама ў сваёй кватэры, рабочы ВА «Гарызонт» у бойцы самаробным нажом забіў сабутэльніка». «У вёсцы Партызанаўка Слонімскага раёна п'яны шафёр у час сваркі нажом забіў жонку». Згадзіцеся — чырвоны аловак больш за ўсё ходзіць па такіх паведамленнях. Але пойдзем далей. «У Мінску патрульным нарадам на Камароўскім рынку затрыманы дзесяцікласнік Загальскай сярэдняй школы Любанскага раёна. Ён вырваў з рук пенсіянеркі бутэльку гарэлкі». «У Гродна аператыўнай групай аддзела аховы Кастрычніцкага раёна, якая прыбыла ўначы на выклік аховных сігналізацыі ў харчовым магазіне па вуліцы Фамічова, затрыманы непрацуючы грамадзянін, які разбіў шкло ўваходных дзвярэй, пранік унутр і спрабаваў выкрасці спіртныя напіткі». Вось і мяркуйце самі — ці звязаны п'янства і злачынасць. Для мяне тут адказ адназначны: узаемазвязаны і вельмі моцна. Успомнім: з прыняццем у 1985 годзе антыалкагольнага заканадаўства крымінальная статыстыка стала адразу ж паказваць, падобна барометру, больш яснае надвор'е. Пачала зніжацца колькасць злачынстваў наогул і на глебе п'янства ў прыватнасці. Але эйфарыя працягвалася нядоўга. З 1988 года «працэс пайшоў»... у адваротным напрамку.

— Чаму ж?

— П'янства, нягледзячы на ўсе абмежаванні, пачало перажываць свой рэнесанс. А ўсё таму, што спрабавалі вырашыць вельмі складаную і шматпланавую праблему пакампанейску, кавалерыйскім наскокам. Хоць і быў распрацаваны комплекс нядрэнных мер, але спрацавала на поўную сілу толькі адна — абмежаванне вытворчасці гарэлкі і гарэлачных вырабаў. Аднак гэта нічога не дало. Так, некаторы час прадавалася гарэлкі менш. Дарэчы, зусім не скарацілася ўжыванне алкаголю. Адбылася замена гарэлкі самагонкай.

Калі гаварыць аб захаванні здароўя людзей, выратаванні кацыі, а менавіта гэтым кіраваліся ініцыятары антыалкагольнай кампаніі 1985 года, то і тут пастаўленая мэта не была дасягнута. Больш таго, ужыванне самагонкі замест гарэлкі наносіла і наносіць вялікую шкоду здароўю. З'явіліся вялікія чэргі за алкаголем. Магазіны, якія прадаюць яго, літаральна браліся штурмам. Памятаецца, асабліва ў студзені-лютым 1989 года ў Мінску міліцыя была вымушана каля такіх чэргаў страляць у паветра з табельнай зброі, каб навесці хоць нейкі парадак каля вінных амбразур. П'яніцы, пачалі ўжываць усялякую «хімію», якою толькі ў 1987 годзе па былому Саюзу атруцілася 40 тысяч чалавек, з якіх 11 тысяч загінула. Улічваючы гэта, у кастрычніку 1988 года прымаецца пастанова, дыяметральна процілеглая ранейшым. Вытворчасць спіртных напіткаў павялічваецца.

— А якія меры, акрамя названай вамі стралянины каля магазінаў, спрабавала прыняць міліцыя?

— У рамках прадастаўленых ёй законам паўнамоцтваў выяўляла і карала парушальнікаў антыалкагольнага заканадаўства. За 7 гадоў з 1985 па 1991-ы было прыцягнута да адказнасці звыш двух з палавінай мільёнаў чалавек.

— Дарэчы, якія цяпер нарматыўныя акты ў гэтым плане дзейнічаюць?

— Адказнасць за п'янства ўстаноўлена ўказамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, якія перыядычна выдаваліся ў 1965, 1972, 1974, 1985, 1987 гадах, з некаторымі змяненнямі і дапаўненнямі, а таксама Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях, прынятым у 1984 годзе. І ўсе яны прыкладна аднаго плана — узмацненне адказнасці за п'янства. У красавіку бягучага года Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў Закон аб змяненнях і дапаўненнях у Кодэксе. Яны закранулі перш за ўсё санкцыі. Усе штрафныя санкцыі, з улікам інфляцыі, павялічаны ў 5 разоў. Вось, напрыклад, чытаем 159-ы артыкул Кодэкса «Распіванне спіртных напіткаў у грамадскіх месцах ці з'яўленне ў грамадскіх месцах у п'яным выглядзе»... Калі раней за падобныя парушэнні прадугледжваўся штраф у памеры ад дваццаці да трыццаці рублёў, то цяпер парушальніку прыйдзецца плаціць 100—150 рублёў. Устаноўлены і новы кошт за паслугі медвыцвярэзніка: за ноч, праведзеную там, — 250 рублёў.

— Дарэчы, а як за рубяжом? Ці ёсць там медвыцвярэзнікі? У чым падпарадкаванні яны знаходзяцца?

— Згодна з тымі, далёка не поўнымі данымі, што ёсць у нас, і за рубяжом, існуюць установы, якія нагадваюць нашы медвыцвярэзнікі. Але функцыяніруюць яны хутчэй як установы рэабілітацыі пры органах аховы здароўя, дапамагаюць чалавечаму арганізму аднаўляцца пасля ўжывання алкаголю. Да паліцыі ці юстыцыі яны адносін не маюць. Прававой нагрузкі не нясуць. У мінулым годзе наша міністэрства выступіла ў Саўміне ініцыятарам перадачы медвыцвярэзнікаў у сістэму аховы здароўя. Пакуль што гэта пытанне не вырашаецца. Міністэрства аховы здароўя супраціўляецца гэтаму і не хоча браць медвыцвярэзнікі на свой баланс. Мы лічым, што праблему трэба вырашаць. Зніклі б многія канфліктныя сітуацыі, ды і органы ўнутраных спраў вызваліліся б ад неўласцівых ім функцый.

— І калі мы ўжо закранулі сістэму аховы здароўя, то што вы можаце сказаць аб выкарыстанні экстрасенсорыкі ў лячэнні алкагалізму?

— Гэта пытанне хутчэй да спецыялістаў. Аднак, як мне ўяўляецца, у вылячэнні ад гэтай хваробы можна і трэба выкарыстоўваць усе даступныя і дазволеныя меры. Галоўнае, каб яны давалі вынікі. Скажам, эфект работы вядомых псіхіятраў-наркологаў, такіх, як Даўжэнка, Данская, Шычко і іншых, не выклікае сумненняў, іх методыку трэба ўсяляк распаўсюджваць. Любыя формы тут добрыя. Галоўнае, каб чалавек хацеў вылечыцца. Калі ж ён супраціўляецца, то як яго можна лячыць?

— У гэтай сувязі нельга не закрануць тэмы ЛПП?

— Менавіта так. Мы спусціліся на зямлю і нарэшце перасталі хлусіць сабе, што гэта найперш лячэбныя ўстановы. У чэрвені мінулага года прыняты новы Закон — «Аб мерах прымусовага ўздзеяння ў адносінах да хранічных алкаголікаў і наркаманаў, якія сістэматычна парушаюць грамадскі парадак ці правы іншых асоб». Ён кардынальна змяніў і прававое становішча грамадзян, якія знаходзяцца ў ЛПП. Цяпер ужо гэта не хворыя, а прымусова-ізаляваныя правапарушальнікі. Калі раней падставай для накіравання ў ЛПП была адмова чалавека ад добраахвотнага лячэння, то цяпер абавязковай з'яўляецца іншая ўмова — калі на глебе п'янства ён робіць правапарушэнне ці парушае правы іншых асоб.

— А як вам бачыцца вырашэнне праблемы п'янства і алкагалізму?

— Перш за ўсё хачу падкрэсліць, што гэта праблема не толькі і не столькі залежыць ад міліцыі. Скажу больш. Мне імпануе думка доктара псіхалагічных навук Пятра Шыхірава, выказаная ім у гутарцы з карэспандэнтам ТАСС у пачатку мінулага года. Яна зводзіцца да наступных асноўных пазіцый. Забароны, карныя меры толькі азлабляюць чалавека, асабліва таго, хто п'е. Хваробу трэба лячыць паслядоўна і планамерна па спецыяльнай праграме. Такая праграма павінна быць дастаткова даўгачаснай, яе эфект нельга адразу вызначыць. Трэба ўзняць статус здаровага чалавека: здароўе патрэбна не толькі для таго, каб жыць больш, але і каб жыць лепш, больш якасна, паўней. Неабходна працяглая і карпатлівая кампанія па ўхіленню ганення і «кляймення» ганьбай алкаголікаў.

Алкаголік, які прызнаў сваю хваробу, павінен выклікаць не меншае грамадскае спачуванне, чым, скажам, хворы на рак. Дыскрымінаваць яго — значыць, штурхаць да яшчэ большага п'янства...

80 працэнтаў нашага насельніцтва ўжываюць алкаголь. Таму змагацца з гэтай з'явай толькі забароннымі метадамі — змагацца з уласным народам. Зразумела, строга навуковая кампанія паступовага працверазення людзей патрабуе матэрыяльных і арганізацыйных выдаткаў, але яны акупяцца здароўем пакаленняў, павышэннем якасці жыцця.

Гутарыў Юрый РАЖАЎ.

РОЗГАЛАС

РАСКЛАДАЙЦЕ КУПАЛЛЯ АГОНЬ!

Па каталіцкаму календару сёння на Беларусі адзначаецца адно з найбольш старажытных і самых прыгожых народных свят—Купалле. Яно прыпадае на перыяд летняга соцдастаяння і пад рознымі назвамі вядомае многім еўрапейскім народам. У суседняй Латвіі, напрыклад, бліжэйшыя тры дні будуць нават нерабочымі.

У старажытных беларускіх граматах Купалле ўзгадваецца яшчэ ў XII стагоддзі.

23 чэрвеня жанчыны збіралі лекавыя травы і, каб надаць ім цудадзейную моц, спявалі купальскія песні. Надвячоркам моладзь выпраўлялася на загадзя выбранае месца — на выган, высокі бераг ракі, раскладвалася вялікае вогнішча, высока на жэрдцы паднімалі прасмоленае кола.

Вакол вогнішча вадзіліся карагоды, найбольш смелыя скакалі праз агонь, дзяўчаты і хлопцы перакідваліся праз яго вянкамі. Старыя людзі расказвалі пра розныя здарэнні, паданні.

Самая паэтычная і рамантычная з іх — легенда пра папараць-кветку, якая цвіце раз у год якраз у гэту ноч.

Дзяўчаты варажылі пра будучае замужжа, кідалі ў ваду вянкі.

Усе разам ганялі «ведзьму», якая, як лічылася, у гэтую ноч адбірала ў кароў малако. На раніцу грамадой ішлі купацца, сустракаць усход сонца. Паводле старажытных паданняў, у гэтую ноч звяры, птушкі і дрэвы маглі перагаворвацца між сабой.

24 чэрвеня — Іаан Прадцеча (Хрысціцель), якога на Беларусі называюць Іванам Купалам.

І З БЗВ— АГУЛЬНАЯ МОВА

Армія—не рэч для расцягвання па розных ідэалагічных кутках. Таму вельмі важна, каб у воінскіх калектывах зацвярджаўся патрыятызм аднаго колеру — дзяржаўнага.

Менавіта аб гэтым ішла размова на сустрэчы кіраўніцтва Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь з членамі Выканаўчага Савета Беларускага згуртавання ваеннаслужачых.

СПАТКАННЕ Ў ГЕРВЯТАХ

19—20 чэрвеня ў Гервятах Астравецкага раёна адбылося афіцыяльнае спатканне гісторыкаў Беларусі і Літвы, названае «Беларуска-літоўскі стол, прысвечаны Вялікаму Княству Літоўскаму». Арганізатарамі і ініцыятарамі спаткання выступілі Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, інстытуты гісторыі акадэмій навук Беларусі і Літвы, аддзел культуры Астравецкага райвыканкома, Беларускі народны фронт і літоўскі «Саюдзіс». Прысутнічалі кіраўнікі гэтых арганізацый, гісторыкі, археолагі, філолагі, лінгвісты, гісторыкі літаратуры.

Фундатарамі «круглага стала» сталі доктар Анджэй Цэханавецкі (Лондан), Беларускі інстытут навукі і мастацтва (Нью-Йорк), Беларускі фонд культуры, калгас «Радзіма» (Гервяты).

Пасля таго як Літва і Беларусь сталі незалежнымі дзяржавамі, узнікла неабходнасць сістэматызаваць сваю гістарычную навуку, пазбавіцца ад ідэалагічных напластаванняў, фальсіфікацый перыяду камунізму і скарэкціраваць ацэнкі і погляды на агульную гісторыю двюх суверэнных краін.

Спатканне адбывалася ў выключна цёплай і сяброўскай атмасферы ўзаемаразумення і павагі. Абмеркаванне агульных праблем гісторыі Вялікага Княства завяршылася прыняццем вынікового дакумента — «Паведамлення», прынятага ўдзельнікамі «круглага стала».

Зянон ПАЗНЯК.

Беларусь адчыняе дзверы ў еўрапейскі дом

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Значнае месца ў праграме знаходжання ўрадавай дэлегацыі ў Швейцарыі занялі кантакты з прадстаўнікамі дзелавых колаў. Грунтоўная размова адбылася на сустрэчы прэм'ер-міністра рэспублікі з членамі савета Міжнароднага фонду прадпрымальнікаў Жэневы ў час наведання вядомай электроннай карпарацыі «Дыжытал эквіпмэнт».

Выключную цікавасць выклікалі ў членаў дэлегацыі прапановы міжнароднай карпарацыі «Нестле», якая прадставіла рад праектаў рэарганізацыі прамысловасці па вытворчасці прадуктаў харчавання.

Аб магчымых напрамках супрацоўніцтва ў справе навучання рыначнаму менеджменту маладых прадпрымальнікаў з Беларусі гаварыў Старшыня Савета Міністраў пры наведанні Міжнароднага інстытута кіравання і развіцця ў Лазане.

Фіналам дзелавых сустрэч і гутарак у Швейцарыі стаў удзел беларускай дэлегацыі ў рабоце ўсееўрапейскага форуму «Еўрапейскі дом: рэальнасць і перспектывы», які адбыўся ў горадзе Кран-Мантана. Форум — традыцыйнае мерапрыемства, якое штогод праводзіцца спецыяльным усееўрапейскім фондам, што аб'ядноўвае вядомых палітычных і дзелавых людзей Еўропы. На форум у Кран-Мантану прыбылі лідэры ўрадаў, а таксама кіраўнікі рада еўрапейскіх дзяржаў, краін СНД, прадстаўнікі буйнога бізнесу, вядомыя ў мінулым палітычныя дзеячы.

Якой быць Еўропе ў бліжэйшай будучыні? Змяненні ў былым СССР кардынальна мяняюць у тым ліку і лёс Еўрапейскага кантынента. Аб гэтых і іншых праблемах зацікаўлена дыскуціравалі ўдзельнікі форуму. На пленарным пасяджэнні выступіў В. Ф. Кебіч. Каменціруючы яго выступленне, друк адзначыў, што Беларусь хутчэй за іншыя дзяржавы СНД адчыняе дзверы ў еўрапейскі дом дзякуючы сваёй стабільнасці і ўменню спакойна, але няўхільна ісці па шляху рэформ.

В. Ф. Кебіч у час работы форуму сустрэўся з шэрагам кіраўнікоў і іншых высокіх службовых асоб еўрапейскіх дзяржаў. Адбыліся таксама карысныя перагаворы з буйнымі бізнесменамі, якія прымалі ўдзел у пасяджэннях форуму. У прайшоўшых мерапрыемствах і сустрэчах прынялі ўдзел міністр замежных спраў Беларусі П. К. Краўчанка, намеснік старшыні Кантрольнай палаты рэспублікі В. І. Радомскі, іншыя афіцыяльныя асобы.

(БЕЛТА).

СПОВЕДЗЬ... ПА ТЭЛЕФОНЕ

ПІНСК. Такую магчымасць прадаставіў пінчанам выканком гарадскога Савета, заснаваўшы службу даверу. Цяпер кожны гараджанін, які стаў ахвярай стрэсу ці атрымаў якую-небудзь маральную траўму, можа па тэлефоне пракансультавацца з псіхолагам, педагогам, проста бывалым чалавекам.

«ВЯСЁЛКА» З ЖАМЧУЖНАГА

Светлыя і самабытныя мелодыі, якія выконвае фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Вясёлка» з пасёлка Жамчужны Баранавіцкага раёна. Зусім нядаўна, але адразу смела і па-дзіцячаму шчыра заявіў аб сабе гэты калектыў. Нараджэннем жа сваім ён абавязаны выкладчыку мясцовай школы Сяргею Вітальевічу Логінаву. Таленавіты музыкант, тонкі знаўца мясцовых народных традыцый і звычаяў, ён і дзяцей прывабіў ідэяй адраджэння і захавання мелодый роднага краю. Нямала папрацаваў Логінаў над тым, каб адрадзіць і абнавіць старадаўнія музычныя інструменты. Калі бяруць дзеці ў рукі свістулькі, дзеравяшкі, трашчоткі, выконваемыя мелодыі набываюць арыгінальную гукавую палітру і сапраўды народнае гучанне.

«Вясёлка» пакарае сарцы тых, хто хоць аднойчы пачуе россып яе напеваў. Запрошана яна і на прэстыжны Сусветны фестываль дзіцячай фальклорнай творчасці, які ў адпаведнасці з рашэннем ЮНЕСКО ўпершыню праводзіцца ў гэтым годзе ў Чэха-Славакіі.

НА ЗДЫМКУ: як і шмат гадоў назад...

Фота Уладзіміра МЯЖЭВІЧА. (БЕЛТА).

ПА ЧУТКАХ І НА САМАЙ СПРАВЕ

Што здарылася з салігорскім дырэктарам?

— Адкажыце, калі ласка, гэта праўда, што дырэктар Салігорскай трыкатажнай фабрыкі арыштаваны пры атрыманні хабару ў 200 тысяч рублёў?

— Па Салігорску ходзяць чуткі, што ў Мінску работнікамі міліцыі затрыманы дырэктар трыкатажнага камбіната. Многія гавораць, што тут дапушчана нейкая памылка. А як на самай справе?

(З ТЭЛЕФОННЫХ ЗВАНКОЎ У РЭДАКЦЫЮ).

ШТОДЗЁННА ў «ЗВЯЗДУ» людзі звяртаюцца з самымі рознымі пытаннямі. Што датычыць вышэй прыведзеных, то, прызнацца, рэдакцыя не магла адразу даць на іх нейкага канкрэтнага адказу. Па-першае, мы самі ўпершыню з тэлефонных званкоў пачулі такую неардынарную навіну і сапраўды нічога не ведалі пра тое, што здарылася з кіраўніком аднаго з буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў Салігорска. А па-другое, і гэтыя пытанні-здагадкі, што ўзніклі нібыта паводле чутак, як кажуць, у нейкай ступені адно аднаму дыяметральна процілеглыя. І праўда, каму ж верыць?

Было вырашана ўдакладніць гэты не зусім просты факт на месцы, у Салігорску, у час камандзіроўкі, якая, дарэчы, якраз падаспела туды зусім з іншай мэтай.

Адзін з тутэйшых маіх субяседнікаў выклаў, на першы погляд, даволі дзіўную тэорыю. Маўляў, у нашым горадзе некаторыя любяць «перамываць» адзін аднаму косткі. Таму і запускаюць розныя плёткі. Калі ні пра каго нічога скандальнага не чуваць, то, бачыце, сумна, нецікава жыць.

Міжволі падумалася, што выпадак з дырэктарам таксама звычайная чарговая плётка, недарэчная байка. Але ці так гэта?

Вось што пры сустрэчах расказалі:

Салігорскі міжрайпракурор Іосіф-Іосіфавіч ЖЫБУЛЬ: Аб тым, што ў Мінску затрымана дырэктар трыкатажнага камбіната Эмілія Залманаўна Абідзіентава, для мяне было поўнай нечаканасцю. А для горада гэта з'явілася наогул шокам. Асабліва для больш чым трохтысячнага калектыву прадпрыемства, якое яна шмат гадоў узначальвае. Чаму? Наколькі ведаю, для рабочых іх кіраўнік нямала зрабіла ў сацыяльным плане, і зарплата тут даволі высокая. На камбінаце цяпер проста баяцца, што без Абідзіентавай усё разваліцца, людзі застануцца без работы, што ў наш час асабліва пужае.

У падтрымку арыштаванай на камбінаце прайшоў сход. Збіраўся на сваё пасяджэнне таксама савет дырэктараў горада.

Разам з тым па горадзе папаўзлі чуткі, якія абрасталі рознымі небыліцамі, выдумкамі. Адна з іх такая, што, маўляў, нехта хоча дырэктара «выбіць» са службовага крэсла, каб заняць яе пасаду, вось і арганізавалі гэту «правакацыю».

Як работнік праваахоўнага органа хачу зазначыць, што пасля 10 дзён утрымання пад вартай Абідзіентавай абавязаны прад'явіць абвінавачванне. А яно павінна грунтавацца на доказах.

Старшыня савета дырэктараў г. Салігорска, кіраўнік народнага прадпрыемства «Калінка» Васіль Якаўлевіч КАВАЛЕВІЧ: Аб тым, што арыштавана Абідзіентава, я асабіста даведаўся ў Мінску. Быў вельмі здзіўлены і, шчыра скажу, нават не паверыў, што такое магло здарыцца. Чаму? Гадоў дзесяць сам працаваў на трыкатажным камбінаце і ведаў яго дырэктара як талковага кіраўніка. Ды і ў горадзе яна карысталася аўтарытэтам.

На пасяджэнні савета дырэктараў старшыня гарвыканкома М. Юрчык праінфармаваў аб тым, што здарылася. Затым было прынята рашэнне хадайнічаць перад пракуратурай г. Мінска аб змяненні меры стрымання дырэктару трыкатажнага камбіната Абідзіентавай Эміліі Залманаўне. Савет характарызуе Абідзіентаву як актыўнага, граматнага кіраўніка, які працуе на камбінаце з дня яго заснавання.

Зразумейце мяне правільна. Прынята такое рашэнне з гуманным намерам, улічваючы яе ўзрост, а не з нейкай мэтай апраўдаць, выгарадзіць.

Намеснік начальніка Галоўнага следчага ўпраўлення Пракуратуры Рэспублікі Беларусь Сцяпан Іванавіч МІХАЛЬЧУК: Так, гэта праўда, што Э. Абідзіентава арыштавана. Яна затрымана 20 мая за атрыманне хабару ў буйным размеры. Супраць яе ўзбуджана крымінальная справа і праводзіцца расследаванне.

Для змянення меры стрымання мы не знаходзім падстаў. Хоць, сапраўды, з такой просьбай звярнуўся калектыў трыкатажнага камбіната. Паступае нам нямала хадайніцтваў і ад іншых арганізацый, асоб. Безумоўна, усё прааналізуем, глыбока і дэталёва ўнікнем у сутнасць справы. І ў далейшым, магчыма, будуць улічаны ўзрост, здароўе і сямейнае становішча затрыманай. У бліжэйшы час яна будзе прадстаўлена спецыялістам, якія і вызначаць яе цяперашні стан здароўя.

Пакуль жа аб тым, каб вызваліць яе з-пад варты, узяўшы падпіску аб нявыездзе, не можа быць і гаворкі.

— Чым гэта можна растлумачыць? Згодна з заканадаўствам, арыштаванаму павінна быць прад'яўлена абвінавачванне на працягу 10 сутак. Калі гэта не зроблена, чалавека трэба вызваляць з-пад варты і яшчэ прасіць прабачэння за дапушчаную недарэчнасць. Так? У даным выпадку мінула ўжо больш месяца...

— Усё правільна, калі няма доказаў і нельга прад'явіць абвінавачванне. У тым уся і бяда, што такія доказы ёсць, і яны вельмі сур'ёзныя, важкія. Больш таго, у ходзе следства ўскрываюцца ўсё новыя факты, шырыцца іх геаграфія. Не выключана і тое, што гэта крымінальная справа з пракуратуры Мінска будзе перададзена ў рэспубліканскую.

Адным словам, следства працягваецца...

Іван БРАЛКА,
спец. кар. «Звязды».
Салігорск—Мінск.

ФАКТ

Савет Федэрацыі прафсаюзаў рэспублікі і прэзідыум Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі накіравалі сумесны зварот да кіраўнікоў урадаў СНД, чарговая сустрэча якіх, як вядома, адбудзецца 26 чэрвеня ў Мінску.

Звярнуцца да высокага сходу прымушаюць глыбокія крызісныя з'явы, трывога за будучыню нацыі, рэальная пагроза распаду вытворчага і навуковага патэнцыялу рэспублікі.

Прафсаюзы і асацыяцыя прамыслоўцаў лічаць неабходным прыняць шэраг мер, накіраваных на стабілізацыю эканомікі і прадухіленне далейшага зніжэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва.

***

Беларускі ўрад прыняў пастанову аб увядзенні банкаўскіх чэкавых кніжак. Мяркуецца, што яны дазволяць расшырыць сферу безнаяўнага грашовага абарачэння і спрасціць разлікі насельніцтва за тавары і паслугі.

Чэкавыя кніжкі будуць выдавацца жыхарам рэспублікі ўсімі ўстановамі банкаў і дзейнічаць толькі на яе тэрыторыі.

***

177 выпускнікоў Львоўскага вышэйшага ваеннага вучылішча сталі першымі ўкраінскімі афіцэрамі, спецыяльна падрыхтаванымі для службы ў Нацыянальных узброеных сілах.

Раней у гэтым вучылішчы рыхтаваліся кадры палітработнікаў і ваенных журналістаў для Савецкай Арміі.

***

Новыя мытныя правілы распрацоўваюцца ў нашай рэспубліцы. Да пачатку ліпеня яны будуць прадстаўлены ў Савет Міністраў, — сказаў у інтэрв'ю «Радыёфакту» першы намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь Пётр Крачко.

Імі, у прыватнасці, прадугледжана правядзенне сумеснага нагляду на граніцы беларускімі і польскімі мытнымі службамі.

Дакумент, які прадугледжвае абарону турыстаў ад рэкету ў Польшчы, прапанавала распрацаваць Міністэрству ўнутраных спраў упраўленне па замежнаму турызму Дзяржкамітэта па знешнеэканамічных сувязях Рэспублікі Беларусь. Пра гэта заявіў начальнік упраўлення Уладзімір Куранкоў.

***

Урад Літвы прадаставіў магчымасць органам мясцовага самакіравання самім зацвярджаць цэны на вялікую колькасць тавараў. Розніца ў іх ношце атрымалася вялікая. Так, жытні хлеб у літоўскай сталіцы і ў Каўнасе каштуе 8 рублёў, а ў Шаўлях — 3 рублі, за чыстку мужчынскага касцюма ў Друскінінкаі даводзіцца плаціць 150 рублёў, у Шаўлях — у пяць разоў менш.

***

Пры рай- і гарвыканкомах рэспублікі пачалі арганізоўвацца аддзелы па справах моладзі і рабоце з насельніцтвам па месцы жыхарства. Адбылася першая прэзентацыя такога аддзела ў Фрунзенскім райвыканкоме Мінска.

НА ДВОР'Е

24 чэрвеня

Сёння ўдзень па рэспубліцы воблачнае з праясненнямі надвор'е, дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ў Гродна, Віцебску, Мінску, Магілёве — 16—18, Гомелі — 21—23, Брэсце — 22—24 градусы цяпла.

У наступныя двое сутак 25-га на большай частцы, 26-га па поўдню — дажджы. Тэмпература паветра 25-га ўначы — 9—14, удзень 15—20, 26-га ўначы— 6—11, удзень— 17—22 градусы цяпла.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

НАША ПЛАНЕТА— ЖЫВАЯ ІСТОТА

ДА ТАКОЙ ВЫСНОВЫ ПРЫЙШЛА ГРУПА ВУЧОНЫХ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ І. ЯНІЦКАГА

Інстытут мінеральнай сыравіны, у якім працуе І. Яніцкі, да нядаўняга часу лічыўся сакрэтным. І. Яніцкі і група яго калег у гэтым інстытуце займаліся праблемай пошукаў месцанараджэння радыеактыўных металаў. Згодна з адной з гіпотэз, прыкметай месцанараджэння радыеактыўных металаў з'яўляецца скапленне прыроднага газу гелію ў зямной кары. Каб вызначыць месца канцэнтрацыі гелію, рабіліся спецыяльныя здымкі, якія і далі магчымасць пазнаць неядомыя раней заканамернасці ў будове зямной кары. Дзякуючы гэтаму стаў зразумелым механізм, што ляжыць у аснове шэрагу з'яў, якія вучоныя даўно назіралі, але растлумачыць не маглі.

Да такіх з'яў, напрыклад, адносяцца паводзіны надвор'я ў Маскве ў час жнівеньскага перавароту (1991 г.). У ноч на 21-е, калі танкі сталі падступаць да Белага дома, нечакана пачаўся лівень. Дождж стаяў суцэльнай сцяной, і цяжка было заўважыць, што адбываецца за два крокі ад цябе. Многія масквічы сцвярджалі, што ніколі не бачылі нічога падобнага. Гэта была рашаючая ноч перавароту, і дождж у многім дапамог вызначыць яго лёс. На наступны дзень на плошчы перад Домам урада сабраўся натоўп — людзі віншавалі адзін аднаго з перамогай дэмакратыі. Ярка свяціла сонца, над галавой не было ні воблачка — здавалася неверагодным, але стваралася поўнае ўражанне, што надвор'е радуецца разам з усімі.

За месяц да жнівеньскіх падзей у «Литературной газете» быў апублікаваны артыкул, дзе прыводзіліся дзіўныя заканамернасці адносна стану грамадства і паводзін стыхіі. Як прыклады — землетрасенне ў Арменіі і нацыянальныя канфлікты ў гэтым рэгіёне, якія папярэднічалі яму; рэвалюцыя ў Румыніі і затым землетрасенне і г. д. Аўтар успамінаў таксама розныя прыклады з расійскай гісторыі, якія сведчылі аб тым, што існуе сувязь паміж унутраным станам людзей і падзеямі, што адбываюцца на Зямлі. Атрымлівалася — як толькі сацыяльныя катаклізмы ці хваляванні ахопліваюць вялікія масы людзей, гэта выліваецца праз некаторы час у стыхійнае бедства ці катастрофу.

Уласна, група вучоных пад кіраўніцтвам Яніцкага даўно заўважыла падобныя заканамернасці. Як было вядома і раней, розным аварыям і катастрофам часта папярэднічае магутны разбуральны працэс, які ахоплівае атмасферу, зямную кару, гідрасферу — словам, усё асяроддзе, а таксама палі — гравітацыйныя, акустычныя, гелієвыя і г. д. Ён распаўсюджваецца не толькі на прыродныя сістэмы, але і на тое, што створана чалавекам: транспарт, сувязь, трубаправоды, будаўнічыя, інжынерныя збудаванні і, што ўжо зусім сур'ёзна, ваенныя арсеналы і атамныя электрастанцыі. Гэты працэс не быў прыкметным для звычайнага позірку, а рэгістраваўся спецыяльнымі прыборамі і станавіўся відавочным толькі ў той момант, калі разбуральная энергія выходзіла наверх у выглядзе катастрофы ці стыхійнага бедства. Гэта было падобна на хваробу, якая ахоплівае ўвесь арганізм чалавека, але становіцца яўнай, праяўляючыся ў выглядзе язвы ці нарыву ў самым слабым месцы — дзе тонка, там і рвецца.

Вучоныя спрабавалі прасачыць, у які момант і чаму нараджаецца гэты разбуральны працэс. Аказалася, што каталізатарам нярэдка з'яўляецца ўспляск негатыўных эмоцый вялікай масы людзей, ад якога разбуральны працэс пачынае хвалямі распаўсюджвацца на ўсё навокал. Высветлілася, што Зямля чула рэагуе як на стан навакольнай касмічнай прасторы, так і на тое, што адбываецца на яе паверхні, гэта значыць у паводзінах людзей.

Аднак «рэакцыя ў адказ» Зямлі ў многіх выпадках не была механічнай, а ў значна большай ступені нагадвала ўчынак разумнай істоты. Так, пры аналізе катастроф у вучоных часам складвалася ўражанне, што падзеі, якія папярэднічалі ім, кімсьці старанна спланаваны. Цяпер Яніцкі ўпэўнены: многія катастрофы вызначаюцца асаблівым сэнсам. Ён мае на ўвазе, што адбываюцца яны для таго, каб прадухіліць катаклізмы глабальнага маштабу, прымусіць людзей спыніцца, падумаць і знайсці правільны шлях, калі памылку яшчэ можна выправіць. Яніцкі лічыць, напрыклад, што чарнобыльская катастрофа зусім не выпадковая — «яна выключыла магчымасць глабальнай тэрмаядзернай вайны». Яна прымусіла шырокія колы людзей ушчыльную заняцца праблемай бяспекі атамных станцый і зноў задумацца аб выніках ядзернай вайны.

Гіпотэзу таго, што Зямля з'яўляецца разумнай істотай, пацвярджалі і іншыя факты, сабраныя вучонымі. Напрыклад, яны пераканаліся ў тым, што правіла «вока за вока» ў адносінах да Зямлі дзейнічае далёка не заўсёды. Некаторыя тэрыторыі, напрыклад, на працягу пэўнага часу могуць як бы прыкрывацца ахоўным каўпаком, і разбуральны працэс будзе іх абыходзіць. Апошнім часам такім месцам з'яўлялася Масква. Стыхійныя бедствы, якія па ўсіх правілах традыцыйнай метэаралогіі павінны былі дасягнуць сталіцы, дайшоўшы да яе межаў, спыняліся, быццам перад нябачнай сцяной. Увесь час штосьці здаралася на подступах да Масквы, але сам горад, нягледзячы на тое, што тут кіпелі палітычныя страсці, заставаўся некранутым.

Вывад, які зрабілі вучоныя ў выніку ўсіх гэтых даследаванняў, гучыць як фантастыка. «Наша планета — жывая, разумная істота, здольная рэагаваць на дзеянні людзей», — заявіў на дыспуце, што адбыўся зімой гэтага года ў маскоўскім Доме вучоных, І. Яніцкі.

І яшчэ адзін вывад, зроблены вучонымі: не толькі паводзіны людзей уплываюць на тое, што адбываецца на Зямлі, але і ўсё, што адбываецца на Зямлі, уплывае на паводзіны людзей. Прычым калі ўздзеянне людзей на Зямлю дасягне крытычнай кропкі, гэтыя «арэлі» будуць расхістаны да мяжы. У такім выпадку, лічыць Яніцкі, мы ўсе станем ахвярай глабальнай катастрофы.

Такім чынам, даследаванні Яніцкага пацвердзілі тое, аб чым многія даўно здагадваліся: Зямля — жывая, разумная істота.

Але, мяркуючы па фактах, прааналізаваных вучонымі, адносіны чалавецтва з Зямлёй найбольш нагадваюць то затухаючы, то зноў успыхваючы няспынны сямейны скандал. Дзіця груба размаўляе з маці, усяляк крыўдзіць яе, але і яна — замест таго каб разабрацца, што адбываецца — даганяе дзіця і б'е яго. Адносіны ўсё далей і далей заходзяць у тупік.

Псіхолагі сцвярджаюць, што прычынай такіх узаемаадносін у сям'і нярэдка з'яўляецца негатыўны вопыт зносін, які, валодаючы ўласцівасцю з часам накопліваць, усё больш засланяе сапраўдныя пачуцці.

Відаць, ва ўзаемаўплыве чалавецтва і Зямлі таксама прысутнічае негатыўны вопыт. Гэта вопыт не толькі апошніх пакаленняў, але і многіх пакаленняў людзей, якія жылі і паміралі, змагаючыся за сваё існаванне, — з прыродай, са стыхіямі, з Зямлёй. Дзе ўжо тут было думаць аб пачуццях!

Сёння на пытанне: «Люблю я Зямлю ці не?» я адназначна адказваю — «Не». Мае знаёмыя задалі сабе тое ж пытанне. І атрымалі такі ж адказ — «Не». Цікава, што адказала б на гэта пытанне Зямля?

Псіхолагі сцвярджаюць, што адносіны паміж людзьмі цяжка палепшыць адным толькі рашэннем не рабіць непрыемнасцей адзін аднаму. Хоць і гэта немалаважна. Калі аднавіць гармонію і адзінства на ўзроўні пачуццяў, пытання аб непрыемнасцях наогул не будзе. Дык, можа, настаў час звярнуцца за дапамогай да псіхолагаў, каб аднавіць нашы адносіны з маці па імені Зямля?

Сяргей ПЯТРОЎ.
(Часопіс «Путь к себе»).

БЯРОЗАЎСКІЯ НАВІНЫ

У суботу ў Бярозе павінна адбыцца сапраўднае авіяцыйнае шоу. Лётчыкі-пілатажнікі авіяцыйнай часці, якой 29 чэрвеня споўняецца 50 гадоў, са сваімі калегамі з Кубінкі будуць дэманстраваць адзіночныя палёты і вышэйшы групавы пілатаж. У праграме свята—парашутныя скачкі дэсантнікаў з акрабатыкай у паветры, а таксама паказ сучаснай авіятэхнікі, якая будзе на ўзбраенні будучай беларускай арміі.

Камандаванне часці спадзяецца, што на гэты авіяцыйны спектакль прыбудзе хто-небудзь і з кіраўніцтва РБ.

***

У калгасе-аграфірме «Малеч» хутка будзе сваё піва. І гэта не пустыя словы, бо ячмень ужо варыцца. Магчыма, лічаць калгасныя півавары, што іх прадукцыя будзе прадстаўлена і на свяце авіяцыйнай часці.

ДАЧАКАЮЦЦА, ШТО ЛЮДЗІ ПАЧНУЦЬ КУСАЦЬ САБАК

ГРОДНА. Калі за мінулы год у горадзе за дапамогай пасля ўкусу сабакі звярнуліся 558 чалавек, то толькі за першы квартал гэтага такіх ахвяр ужо 88, ды яшчэ 127 чалавек пацярпелі ад нявысветленых жывёлін. Гарадзкія ўлады пакуль што ніяк не рэагуюць на такое становішча спраў. Напэўна, яны прытрымліваюцца словаў вядомага газетнага магната Херста, які ў свой час сказаў: «Калі сабака пакусае чалавека, гэта нецікава, а вось калі чалавек пакусае сабаку...» Напэўна, каб гарвыканком наёў парадак, трэба каму-небудзь учапіцца зубамі ў сабачы хвост.

АЎТАМАБІЛЬ — НЕ РАСКОША?..

МІНСК. Аўтааматары сталіцы сёння збіраюцца правесці агульнагарадскі мітынг пратэсту. Прычына яго—шматразова ўзрослыя цэны на стаянкі, гаражы, ахову ўласнага транспарту, іншыя праблемы. Напрыклад, за месца на ахоўваемай стаянцы трэба цяпер плаціць 200 рублёў у месяц, саміх стаянак катастрафічна не хапае, а месца для гаража і набыццё яго па даступнай цане даўно перайшлі ў разрад мар. Таму арганізацыйны камітэт заклікаў усіх зацікаўленых асоб сёння а палове сёмай сабрацца ў мікрараёне «Серабранка», каб вырашыць набалелыя пытанні.

Па іроніі лёсу, у гэтыя ж дні па даручэнню Фрунзенскага райвыканкома Мінска акцыянернае таварыства «Проміннвест» будзе праводзіць конкурсны продаж дваццаці незанятых гаражоў, стартавы кошт якіх для фізічных асоб—130 тысяч рублёў, для юрыдычных—150 тысяч. Такія грошы простаму аўтааматару, мабыць, і не сніліся.



ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

АДЧУВАЕЦЦА БЛІЗКАСЦЬ КІТАЯ

Адміністрацыя Новасібірскага навукова-даследчага электронна-тэхналагічнага інстытута вырашыла стымуляваць падаючую ў горадзе нараджальнасць вельмі арыгінальным спосабам. Інтэрнат тут прадастаўляецца толькі тым маладым сем'ям, якія ці ўжо маюць, ці збіраюцца завесці дзяцей. Прычым тэрмін цяжарнасці павінен поўнасцю выключаць магчымасць аборту.

ХТО З'ЕЎ ЧЭМПІЁНА!

На харкаўскім стадыёне «Металіст» датэрмінова закончыўся сезон гонак бегавых свіней. Справа ў тым, што нейкія зламыснікі, хутчэй за ўсё ўчарашнія балельшчыкі, укралі чацвёрку «чэмпіёнаў», а заадно прыхапілі і «алімпійскі рэзерв» — маленькіх парасят.

Што рабіць, калі ў магазінах мяса па шалёных цэнах!

ДЛЯ АМАТАРАЎ НЛА

Свярдлоўскае абласное ўпраўленне Дзяржстраха ўвяло новы від страхавання: ад крадзяжу іншапланецянамі. Застрахаваць можна на любую суму і тэрмін. Умова адна: сваякі знікшага павінны прадставіць неабвержныя доказы таго, што ён выкрадзены прышэльцамі.

Цікава толькі, што з'яўляецца для Дзяржстраха неабвержным доказам: дастаткова гайкі ад касмічнага карабля ці неабходна даведка з пячаткай з іншай планеты.

ПРАКУРОР ЗДЗІЎЛЯЕЦЦА...

Пракурор Цюменскай вобласці Віктар Багін узбудзіў крымінальную справу супраць кіраўніцтва абласнога тэлебачання. Справа ў тым, што яно паказала амерыканскі баявік «Пацалунак», у якім галоўны герой нецэнзурна выказваецца.

Усхваляваны пракурор заявіў справу з фармулёўкай «за наўмыснае парушэнне грамадскага парадку».

Напэўна, пракурор даўно не размаўляў з нашымі дзецьмі і не ведае, што лаянка амерыканскага кінагероя для іх ужо даўно пройдзены этап.

РАФАЭЛЬ ЗНАЙШОЎСЯ

У адным са старажытных замкаў Вялікабрытаніі знойдзена карціна Рафаэля «Мадонна з немаўлём», якая на працягу больш чым двух стагоддзяў лічылася бясследна знікшай. У свой час уладальнік замка набыў яе за 360 фунтаў стэрлінгаў, сёння яе рыначная цана — 300 мільёнаў фунтаў.

ЧАЛАВЕК-АМФІБІЯ

Чалавек-амфібія зарэгістраваны ў айчыннай кнізе Гінеса. Масквічу Васю Рэзнікаву ўсяго адзін год і дзевяць месяцаў, аднак у басейне ён змог за 15 гадзін 23 мінуты праплысці без перапынку звыш 33 кіламетраў. Стан дзіцяці пасля заплыву быў цудоўным — ён сам вылез з вады і паабедаў сырам.

ГАЗЕТА ДЛЯ БЕСПРАЦОЎНЫХ

У Екацярынбургу пачала распаўсюджвацца новая газета для беспрацоўных «Рынак працы». Паводле слоў рэдактара газеты Яўгеніі Млодзік, рэдакцыя разлічвае на поспех выдання, бо па прагнозах да канца года ў вобласці будзе 400—450 тысяч беспрацоўных. Газета стане для іх адначасова даведнікам і крыніцай інфармацыі.

Па «Розгаласу» дзяжурылі: І. Карней, А. Коктыш, А. Сланевуські, С. Сулкоўскі, І. Шчучэнка, У. Здановіч.
Тэл. 32-44-02, 32-43-03.

Для пачынаючых грыбнікоў і... шпіёнаў

— Выдатная карта для грыбнікоў, — зазначыў адзін чалавек у чарзе.
— І для шпіёнаў, — дадаў другі.

Чарга стаяла каля новага магазіна «Карты» па вуліцы Варвашэні ў Мінску. Абодва пакупнікі мелі рацыю.

Карта, на якой пазначаны нават асобныя дрэвы ў полі, — безумоўна, рэч патрэбная.

Але на памяці ў другога пакупніка быў той час, калі такія падрабязныя ўказальнікі захоўваліся з грыфам «сакрэтна». Шпіёнаманія адышла ў мінулае, а грыбы засталіся.

У гэтым магазіне можна набыць унікальную карту «Мінск і яго наваколле», дзе сантыметр паперы адпавядае двум кіламетрам мясцовасці.

Есць таксама падрабязныя карты розных тэрыторый рэспублікі. У хуткім часе тут з'явяцца выдатныя карты Нясвіжа, Вячы, Крыніцы, Нарачанскага краю.

Гэты магазін, безумоўна, стане папулярным у аматараў падарожжаў, знаўцаў гісторыі, паляўнічых, рыбакоў.

Застаецца пажадаць, каб цудоўныя падрабязныя карты Беларусі хутчэй былі перакладзены на беларускую мову.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

НА ЗДЫМКУ: магазін «Карты» і яго гаспадыня картограф Людміла ФІЛІМОНЧЫК.

ВЫ ПРАСІЛІ РАСКАЗАЦЬ

КАТАСТРОФА З СЭРЦАМ. ЯК ЯЕ ПАЗБЕГНУЦЬ?

Паважаная рэдакцыя! Вельмі добра, што «Звязда» рэгулярна друкуе матэрыялы на медыцынскія тэмы. Але хацелася б больш падрабязна даведацца пра распаўсюджаную хваробу нашага стагоддзя — інфаркт міякарда, якая, нібы тая каса, бязлітасна косіць людзей. І наогул, што мог бы вопытны спецыяліст параіць нам, смяротным, каб лепш эберагчы сваё здароўе і прадоўжыць жыццё?

К. РАГАЧЭЎСКІ,
механізатар
калгаса «Кастрычнік»
Гродзенскага раёна.

Гэтае найважнейшае для чалавека пытанне цікавіць і моцна хвалюе вельмі многіх нашых чытачоў. Па іх просьбе прапануем гутарку з прафесарам кафедры кардыялогіі Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў Уладзімірам ГАРБАЧОВЫМ, якому прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі Беларусі.

— Здаецца, яшчэ нядаўна інфаркт міякарда быў рэдкай з'явай. Толькі ў пачатку стагоддзя медыкі навучыліся дыягнаставаць яго пры жыцці хворага. А яшчэ крыху — і сардэчна-сасудзістыя захворванні аказаліся на першым месцы сярод прычын смяротнасці...

— Гэта катастрофа часта адбываецца раптоўна. Чалавек адчуваў сябе добра, як заўсёды, спяшаўся на работу ці па іншай справе. І раптам, як падкошаны, упаў і... памірае. А перад тым нічым як быццам не хварэў, ні на што не скардзіўся. Дыягназ: інфаркт міякарда. Часам складана бывае правесці дакладную клінічную грань паміж прыступам стэнакардыі, які зацягнуўся, і няцяжкім інфарктам міякарда. Частку хворых стэнакардыя непакоіць па некалькі гадоў, не выклікаючы сур'ёзных вынікаў. Аднак працяглая, упартая стэнакардыя, якая прагрэсіруе, можа служыць прэлюдыяй інфаркту міякарда, прыводзіць да сардэчнай слабасці, нерытмічнай работы сэрца.

У момант прыступу стэнакардыі ў чалавека ўзнікае тупы боль у цэнтральнай частцы грудной клеткі, за грудзінай, які часта аддае ў левую руку і лапатку. Іншы раз ён як бы сядзіць глыбока ў горле. Гэты боль, які можа дасягаць вялікай сілы, суправаджаецца пачуццём страху, слабасцю, з'яўленнем халоднага поту. Але праз дзве-тры хвіліны ён звычайна праходзіць, і чалавек адчувае сябе «здаровым». У іншых хворых гэта не боль, а своеасаблівая пякотка ў грудзях, ціск за грудзінай або ў вобласці шыі. Часта падобныя кароткачасовыя прыступы ўзнікаюць раніцай, асабліва ў халоднае ветранае надвор'е. Нярэдка такія сімптомы развіваюцца пасля сытнай яды, у момант фізічных нагрузак, асабліва ў час хады або пасля вялікага эмацыянальнага напружання, адмоўных псіхалагічных уздзеянняў, хваляванняў — так званага стрэсу.

У некаторых выпадках «лёгкі» інфаркт хворыя пераносяць «на нагах», не звяртаючыся да ўрача. Гэта вельмі небяспечна.

Словам, тут ланцужок такі: атэрасклероз — стэнакардыя — інфаркт. І галоўныя вытокі, віноўнікі яго — няправільнае харчаванне, асабліва празмернае ўжыванне тлушчу, солі, недахват агародніны, фруктаў. Наогул, празмерная яда. У медыцынскай літаратуры цяпер значыцца звыш трыццаці пяці фактараў рызыкі, якія прыводзяць да ішэмічнай хваробы сэрца. Важнейшыя з іх — павышанае ўтрыманне халестэрыну ў крыві, артэрыяльная гіпертанія, курэнне, адмоўныя эмоцыі, залішняя вага цела, цукровы дыябет, алкаголь, гіпадынамія. Смяротнасць ад ішэмічнай хваробы сэрца, напрыклад, у заўзятых курцоў у шэсць разоў вышэйшая, чым у тых, хто не смаліць цыгарэты.

Лішняя вага — таксама кепска. Найбольш эфектыўны спосаб зніжэння яе — збалансаваная дыета. Трэба памятаць, што агульны закон захавання энергіі ў арганізме чалавека дзейнічае гэтак жа, як і ў прыродзе наогул. Таму, калі вага цела павялічваецца, гэта заўсёды азначае: прыток энергіі перавышае яе затраты. Калі гавораць пра неабходнасць фізічнай актыўнасці, то перш за ўсё маецца на ўвазе, што пры гэтым адбываецца «спальванне» лішняга «паліва», якое ёсць у арганізме. Апрача таго, высокая фізічная актыўнасць, калі яна падтрымліваецца на працягу ўсяго жыцця, замаруджвае змяншэнне з узростам масы мышачнай і касцявой тканак.

Хацелася б асобна падкрэсліць: сардэчна-сасудзістыя захворванні бяруць пачатак у дзіцячым і падлеткавым узросце. Ва ўсіх краінах свету прафілактыка або барацьба з гэтымі захворваннямі, як правіла, пачынаецца з 40 гадоў, г. зн. калі хвароба праяўляецца ўжо. Але гэта ўжо прафілактыка самой хваробы, а не яе прычын.

На жаль, нярэдка яшчэ сустракаюцца людзі, якія ўхіляюцца ад кантактаў з медыкамі. Яны катэгарычна сцвярджаюць: «Я здаровы, адчуваю сябе цудоўна», лічачы, што хвароба ніколі не закране іх. Такія людзі могуць шмат курыць, «глушыць» алкаголь, быць нястрыманымі ў ядзе і ў іншых адносінах, бяздумна растрачваючы здароўе. Нам, урачам, ведаючы, чым потым заканчваюцца такія нядбайныя адносіны да свайго здароўя, асабліва крыўдна за гэткіх «аптымістаў».

Хуткасць, з якой адбываецца старэнне, можа змяняцца, рэгулявацца ў даволі шырокіх межах. Калі мы сустракаем чалавека, чый узрост перавысіў 100 гадоў, ці ўрач бачыць пацыента сарака-саракапяцігадовага ўзросту, у якога ўсе праявы паскоранага завядання,— гэта два крайнія полюсы.

— Натуральна, узнікае пытанне: чым можа быць абумоўлена такая кантрасная сасць?

— Перш за ўсё трэба помніць, што мы старэем з кожным днём. Таму штодзень трэба імкнуцца затармазіць гэты працэс, а значыць і час праяўлення хвароб старэння. Але гэта зусім не значыць, што прафілактыку трэба пачынаць з глытання лякарстваў. Перш-наперш неабходна старацца захаваць тую аптымальную вагу цела, якая звычайна складаецца, прыкладна, да 25 гадоў. Гэтая простая парада заснавана на вялікай колькасці фактаў. Чым ніжэйшая вага, тым меншая смяротнасць ад такіх хвароб, як цукровы дыябет, атэрасклероз, ішэмія, інфаркт міякарда, рак...

Усё свядомае жыццё людзі працуюць. На вытворчасці, дома. На сябе і на грамадства. Работа чалавеку неабходная. І не толькі сацыяльна — для іншых, але і фізічна — для самога сябе. Аднак не ўсе гэта разумеюць. А прырода не дрэмле. Яна помсціць за такія памылкі. І вельмі моцна. Калі чалавек не заняты на вытворчасці фізічнай працай, ён павінен кампенсаваць недахват напружанасці іншым шляхам, скажам, не злоўжываць аўтобусам, ліфтам. Хадзіць трэба як мага больш, займацца ў спартыўнай секцыі. Выхадныя дні праводзіць на прыродзе.

— Але не толькі гультайства, лайдацтва, а і слова нярэдка служыць тут прычынай многіх непрыемнасцей.

— Безумоўна. Ветлівае абыходжанне, манера гаварыць спакойна, пазбягаць лаянкі пры спрэчках — важны сродак захавання здароўя. А як часта нам даводзіцца яшчэ сутыкацца з зусім іншымі, адваротнымі фактамі. Зазначу, што ўзаемаадносіны людзей на рабоце, у быце маюць прамыя адносіны да праблемы ўзнікнення шэрагу сардэчна-сасудзістых захворванняў. Гіпертанія, стэнакардыя, інфаркт міякарда вельмі часта звязаны з тымі непрыемнымі сітуацыямі, якія ўзнікаюць на прадпрыемстве, у сям'і. Калі задумацца, то большасць канфліктаў, нават трагедый, звязана не столькі з фізічнымі дзеяннямі, колькі са словам. Крыўднае, зняважлівае, асабліва несправядлівае, нават на адлегласці, напрыклад, па тэлефоне, яно можа нанесці чалавеку траўму ў шмат разоў мацнейшую, чым фізічны ўдар.

— Кардыёлагам у паўсядзённай практыцы часцей за ўсё даводзіцца дэманстраваць сваё майстэрства, дапамагаючы чалавеку ў экстранных выпадках, у першыя мінуты і гадзіны пасля прыступу. Вядома, папярэдзіць хваробу важней, бо лячыць яе вельмі складана. І ўсё ж, як прадбачыць гэты небяспечны момант?

— Распаўсюджана думка, што інфаркт міякарда — хвароба нечаканая. Але звычайна гэта не так. Ёй, як правіла, папярэднічаюць розныя сімптомы, на якія многія не звяртаюць увагі. Трэба кожнаму з нас няўхільна прытрымлівацца асноўных трох запаведзяў: **не перажывай, не курыць, не ўжываць спіртных напіткаў.**

— А што абавязаны ведаць і памятаць тыя, хто перанёс інфаркт? І не толькі яны?

— Перш за ўсё ім неабходны строгі рэжым. Трэба выконваць усе прадпісанні ўрача. Нельга курыць, пераядаць. Карысная спецыяльная лячэбная гімнастыка для трэніроўкі сардэчнай мышцы і сасудаў. Важна, каб практыкаванні не выклікалі перагрузак. Хацелася б перасцерагчы тых, хто, жадаючы займацца фізічнай працай або фізкультурай, пераацэньвае свае магчымасці і бярэ на сябе непасільную нагрузку. У апошнія гады стаў распаўсюджаным выраз «бягом ад інфаркту». На жаль, закончыцца такі «бег» можа сумна, калі не прытрымлівацца важнага прынцыпу — паслядоўнасці ў павеліччэнні фізічных нагрузак. Празмерныя трэніроўкі звычайна выклікаюць вострае перанапружанне сэрца. Таму фізкультурай трэба займацца асцярожна, «дазіравана» і абавязкова пад кантролем урача.

У мяне часта пытаюцца: колькі дадзена пражыць чалавеку? Прырода вызначыла яму, як аднаму з біялагічных відаў, тэрмін больш як сто гадоў. Аднак у Старажытным Рыме саракагадовы чалавек лічыўся ўжо старым, а шасцідзесяцігадовы — дапантанусам, г. зн. прыгодным толькі для ахвяравання. І ў той жа час гісторыя данесла да нас з гэтай эпохі ўзоры рэкорднага даўгалецця: вялікі ўрач Гален жыў 140 гадоў, Сакрат быў атручаны ў 106 гадоў ад роду, Сафокл памёр у 130-гадовым узросце.

Прынята лічыць, што пік творчага развіцця асобы прыпадае на 45 гадоў. Але не такая ўжо вялікая рэдкасць і росквіт творчасці ў больш сталыя гады. Мікеланджэла кіраваў у Рыме будаўніцтвам грандыёзнага сабора, калі яму пераваліла за 80, а Тыцыян пісаў свае сусветнавядомыя шэдэўры да апошняга дня жыцця — 99 гадоў. Розум І. Паўлава захаваў свежасць і вастрыню ў 85, а славутая Яблачкіна засталася на сцэне і пасля 90 гадоў.

Сэрца чалавека можа і павінна быць здаровым. Любое сэрца занадта маладое, каб паміраць. Але зазначу, пры адной абавязковай умове: калі з ім катастрофа не здарыцца.

Гутарыў
Алесь БЯРЖЫНСКІ.

РАДЫЁ

25 чэрвеня

Апошнія паведамленні: 6.00, 7.00, 10.00, 15.00, 20.00, 23.00.
7.00 — «Радыёфант». 8.05 — «Зона асаблівай увагі». Паведамленні з Дзяржкамчарнобыля Беларусі. 8.15 — «Вясковыя ростані». 9.15 — нататкі А. Паўлючэнкі. 10.15 — для дзяцей. А. Лявонаў. «Мядовыя кладоўкі». Інсцэніраваны старонкі кнігі. 10.35 — В. Коўтун. «Вясёлы заасад». Радыёкампазіцыя. 11.00 — «Вы нам пісалі? Адказваем». Па пісьмах і тэлефонных званках. 11.30 — «Справа». Хроніка дзелавога жыцця. 11.40 — «Чалавек. Грамадства. Закон». 12.00 — «Апоўдні». 13.00 — «У абедзенны перапынак». 14.00 — «Беларуская народная песня на эстрадзе». Музычная праграма. 15.10 — апавяданні З. Дудзюк. 16.05 — «Сябрына». Праграма для падлеткаў. 17.00 — «Эканамічны дзённік». 17.10 — «Рокхвалля». Музычная праграма. 17.40 — «Дарагія мае землякі». 18.00 — перадачы абласнога радыё. 19.00 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». 19.45 — «Дзень нашага жыцця». 20.05 — вячэрняя казка. 20.25 — па старонках літаратурна-мастацкіх часопісаў. 21.00 — «Ад шчырага сэрца». Музычная праграма па пісьмах радыёслухачоў. 22.00 — «Клопат». Медыцынскі веснік. 22.10 — «Карані». 22.30 — канцэрт. 23.10 — музыка з праграм радыёстанцыі «Голас Амерыкі». 0.00 — «Начны канал».

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

«Беларусь адкрывае дзверы ў еўрапейскі дом» — падрабязнасці аб візіце Старшыні Савета Міністраў РБ Вячаслава Кебіча ў Швейцарыю.

Інтэрв'ю з намеснікам начальніка ўпраўлення па пытаннях правоў грамадзян, грамадскай бяспекі і абаронная работы Кіраўніцтва справамі Савета Міністраў Беларусі Валерыем Паўлавым **«Гарантыі ваеннаслужачым».**

Роздум над пісьмамі чытачоў аб двухмоўі **«О мовы, о нравы!»**

«Клетачная свабода» — нататкі фельетаніста.

Навіны, замежная інфармацыя.

Рэкламная старонка «Пасрэднік».

ТЭЛЕБАЧАННЕ

25 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

8.45. «Афіцэр з ружай». Маст. фільм з субтытрамі (Югаславія).
14.05. «Пушча». Маст. фільм.
16.15. «Ветразь, вецер і мы». Кінанарыс.
16.30. Навіны.
16.35. «Кожны дзень свята». Дзіцячая музычная школа № 9 г. Мінска.
17.30. «Алі-Баба і сорак разбойнікаў». Мультфільм.
18.00. Хто праполе лён? Перадача з Магілёва.
18.20. Дак. фільм «Даліна нарзанаў».
18.40. Сустрэчы на міжнародным кангрэсе прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў. Перадача 1-я.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. Прафсаюзы: праблемы, каментарыі.
19.35. Роднае слова. Тэлечасопіс.
20.20. Тыдзень беларускага ўрада.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Латарэя ўдачы.
21.30. Студыя «Сэнс» у Ваўкавыскім раёне.
23.00. НІКа.
23.15. «Як зорка на небе ўначы...». Рамансы Л. Абелёвіча на вершы Ф. Цютчава.

І канал. Астанкіна

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. Ранішняя гімнастыка.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
9.50. Мультфільмы.
10.30. «Рыцары прыроды».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
13.10. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. Гэта было... было...
14.40. «Задача з трыма невядомымі». Маст. фільм. 2-я серыя.
15.45. «Кампазіцыя на тэму... Рыжык». Мультфільм.
15.55. Фільм — дзецям. «Гепард вяртаецца».
17.00. Навіны.
17.20. ...Да 16 і старэйшым.
18.00. Дзённік І Міжнароднага юнацкага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага.
18.20. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
19.05. Тэлескоп.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «SOS». Аб сітуацыі ў дзіцячых дамах.
21.05. Маст. фільм «400 хітрыкаў Віржыні». 3-я серыя.
22.00. Музыка ў эфіры. У перапынку **(23.00)** — Навіны.
0.20. Мультфільмы для дарослых «Эй, на тым беразе!», «Дробязь», «Чалавек і слова».
0.45. Дак. фільм «Нараджэнне тэатра Нарты».
1.15. «Задача з трыма невядомымі». Маст. фільм. 2-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
7.50. Вольны час. «Увага: здымаю!»
11.50. «Санта-Барбара». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. Тэрмінал.
15.45. У свеце жывёл.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Бізнес і палітыка.
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Студыя «Нотабене».
18.45. «Суддзі». Аб Канстытуцыйным судзе Расіі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. За рамкамі «Вестак».
19.45. Пятае кола.
20.30. «Хроніка». У свеце аўта- і мотаспорту.
21.00. Пятае кола. Працяг.
22.00. Весткі.
22.20. Экран крымінальных паведамленняў.
22.30. На сесіі ВС Расіі.
23.00. Тэніс. Уімблдонскі турнір.

ВАШ САД І АГАРОД

Матэрыялы выпуску падрыхтаваў да друку Мікалай ЧАХОЎСКІ (тэл. 32-41-92).

Пасевы ў канцы чэрвеня

Як ні дзіўна, але сяўба дачніка працягваецца. Сёння, на парозе піка лета, не толькі не позна, але нават неабходна сеяць многія культуры. Свежую сакавітую прадукцыю будзеце мець больш працяглы тэрмін. Культуры будуць без стрэлак і іх не адолеюць шкоднікі. Ураджай, які знімем позняй восенню, будзе надзвычай вітамінным.

У гэты перыяд высяваюцца: кроп, пятрушка, салата, шпінат, крэс-салата, радыска, шчаўе, цыбуля-батун, высаджваецца цыбуля на пяро. Ці ўносіць угнаенні? Абавязкова! Як і пры веснавых работах. Тым больш, што разжыцца летам угнаеннямі лягчэй, чым, скажам, вясной. Глебу перакопваем, рыхлім, робім барозны, паліваем. Апошняе вельмі важна, бо сяўбу праводзім не сухім, а намочаным (недзе і праклюнулася) насеннем. Каб усходы былі дружнымі, радкі «прыкатаем» шырокім бокам вялікай матычкі.

У гэты час можна высяваць рэдзьку — чорную і белую. Перад зямаразкамі знімеце ўраджай. Своечасова прарэджаная, яна добра ўродзіць і што вельмі важна, без стрэлак.

Акучванне і падкормка бульбы

На прысядзібных участках сяляне звычайна не ўносяць пад бульбу дадатковых угнаенняў у выглядзе падкормак, бо перад пасадкай соткі добра ўгнойваюць. Сілкавання хопіць, каб вырасціць добры ўраджай. Цяпер толькі акучванне. Яго звычайна праводзяць пасля дажджу ці паліву. У сухое надвор'е ад «мерапрыемства» варта адмовіцца, бо гэта прывядзе да яшчэ большай страты вільгаці.

Дачнікі ж абавязкова сілкуюць бульбу. Па многіх прычынах. А больш за ўсё таму, што глебы ім адвялі бедныя. За адзін раз іх не давядзеш да ладу.

Што ж даваць у падкормку? Падыдуць амафос ці нітрамафос і попел. Гэта адзін варыянт. Настой каравяку, птушынага памёту ці конскага гною і попелу — другі варыянт. Першы цалкам «хімічны» (попел таксама трэба аднесці да гэтага разраду), другі —арганічны.

Пры першым варыянце даём 200 грамаў амафосу і дзве-тры шклянкі попелу на радок даўжынёю тры метры. Усё рассыпаем, пасля падрыхлім і акучым. Нашы ўгнаенні павінны залягаць на глыбіні да 8—12 сантыметраў. Настой арганікі разліваем па ямках, зробленых ля сцяблінак, пасыпаем попелам, усё акучваем. Норма—не менш літра пад кожны куст. Глыбіня залягання падкормкі ранейшая.

Акучванне павінна прывесці да стварэння новай каранёвай сістэмы, падвесці паветра да каранёў, захаваць плады ад першы, зрабіць глебу пульхнай і даступнай для каранёў расліны. Гэта дасягаецца, калі вышыня радка будзе ў канчатковым выглядзе (пасля другога акучвання) не менш 25—30 сантыметраў з глыбокай канаўкай у міжрадкоўі. Двух акучванняў звычайна дастаткова. Іх заканчваюць да цвіцення і найбольшага разрастання куста. Пасля ўсе работы спыняюцца, бо толькі нашкодзім раслінам.

Вельмі чуйна рэагуе бульба на падкормкі «зялёным чаем». Збіраем крапіву, лісце дзьмухаўцу, лебяды, пырніку і малачаю. Заліваем іх кіпнем і настойваем да чатырох гадзін. Венічкам апырскваем зялёны конус бульбы. Лепш гэта рабіць вечарам.

Мы часта адварваем грыбы і жыжку выліваем. Яе таксама можна выкарыстаць на градцы—развесці ўтрая і паліць пад корань. Зрэшты, буракі, якія падкормлены такім чынам, больш салодкія, а морква набывае прыемны выгляд і смак.

Плямы на памідорах

Вырошчваючы памідоры ў цяплічках, мы не пазбаўляемся небяспекі развіцця розных грыбковых захворванняў. Плёнка засцерагае толькі ад рэзкіх ваганняў тэмпературы. Верхні рубеж нагрэву абмежаваны хіба што прыроднымі магчымасцямі. Гэта вядзе да таго, што ў цяплліцы ўтвараецца то вельмі высокая, то даволі нізкая тэмпература. Гэтак жа мяняецца і вільготнасць паветра. Усё аднолькава небяспечна для раслін.

Таму вельмі карысна наладжваць надзейную вентыляцыю, адкрываючы дзверы і форткі. Размяшчаць іх варта ў розных кутках і ўверсе пад самой плёнкай.

Вядома, страт не пазбегнуць. Самая распаўсюджаная нягода — вяршынная гніль памідораў. На зялёных пладах з'яўляюцца шэрыя плямы. Паступова яны бурэюць. Плады непрыемна пахнуць. Хворыя месцы нейкія ўціснутыя, чорнага ці блізкага да яго колеру.

Такія плады своечасова знімаць і знішчаць. Зменшыць паліўы (толькі неабходныя). Запамятаем, што супраць вяршыннай гнілі эфект даюць толькі прафілактычныя сродкі. Гэта —чаргаванне культур. На ранейшае месца высаджваць памідоры не раней чым праз тры гады, ці поўнасцю мяняць верхні слой грунту (да 10—20 см). Варта ўстрымацца ад пабольшаных дозаў азотных угнаенняў (нават гною).

Добры эфект дае апрацоўка насення перад высевам медным купарвасам (2 г) і марганцоўкай (3 г), разведзенымі ў 1 літры вады.

Суніцы заплылі тлушчам

Мы любім суніцы садовыя. Даглядаем іх ўсёй сям'ёй. А выніку небагата. Лісце зялёнае, высокае, а ягад мала. Часта хварэюць.

Сям'я СЕЛЯЗНЕВЫХ.
г. Гродна.

Прычын няўдач можа быць шмат. Адзін заўзяты агароднік нават зазначыў, што суніцы — такія ж смеццевыя культуры, як, скажам, пырнік. Мы іх несцім, а аддачы няма. Дайце ім развівацца, як хочуць, не апякайце, як дзіця. Хай паваюць за сваё існаванне!

У гэтых словах ёсць, як кажуць класікі, доля ісціны. Сапраўды, вакол гэтых ягад цэлы карагод. Рыхляць, падразаюць, нечым падліваюць, апрацоўваюць хімікатамі... Безумоўна, «свае» работы правесці неабходна: выдаленне старога лісця, праполка і адна падкормка, прывязка кветканосаў ці падкладка пад іх пілавіння, ігліцы, своечасовае выдаленне вусоў. Вось, бадай, і ўсё. І не даваць кустам быць тлустымі.

Па форме лісця і ягад цяпер лёгка вызначыць «чужакоў». Іх трэба пазначыць, пасля збору ўраджаю ягад выдаліць. Відаць і «пустацветы» — мужчынскія экземпляры. Яны цвітуць, а ягад няма. Ёсць экземпляры, якія не даюць нават кветак, а толькі вусы. Іх, вядома, выдаляюць таксама.

Уважліва адбірайце калівы для пасадак. Пакідайце вусы пасля збору асноўнага ўраджаю з найбольш прадуктыўных кустоў. Вусам не давайце разрастацца. Залажылі яны адзін вузельчык — і хопіць, астатні атожылак адразайце.

Узбройцеся палынном

Мы расказвалі аб ахоўных уласцівасцях крывяўніка, дзьмухаўца і іншых культур. Сёння гаворка пойдзе пра палын. Той самы, які вельмі замінае, заглушаючы пасевы і пасадкі. Расце паўсюдна. Бабулі здаўна выкарыстоўвалі яго, каб адвадзіць мух, нават камароў. Клалі ў хаце ля парога, падвешвалі ля сцен. Лічылася, што незвычайны пах горкага палыну адвядзе благое.

Аказваецца, гэту расліну можна з поспехам прымяняць ў барацьбе з рознымі шкоднікамі саду. Падвешаныя ля кроны дрэва, яны «не даюць ходу» розным матылькам. А калі паварыць гэту расліну, настаяць, развесці ў патрэбнай колькасці вады, то атрымаем «лекі» ад розных вусеняў.

Робіцца гэта так. Збіраем сцяблінны і ліст палыну горкага. Кладзём у цянёчку для правільвання. Здабраняем 1 кг зяленіва ці 0,3 кг «сена», змяшчаем у эмаліраваную ёмістасць — і на агонь. Кіпяцім 15 хвілін. Ахаладжваем. Адвар, які атрымаўся, працадзіць, зліць у шкляную тару з добрай накрыўкай. Гэтага «зелля» хапае на 10-літровае вядро. «Гатовую прадукцыю» разбаўляем і апырскваем месцы «дыслакацыі» вусеняў.

Дзеянне палыну ўзмоцніцца, стане больш працяглым, калі дадаваць гаспадарчае мыла — 40 г на тое ж вядро. Ці настой сухога курынага памёту — 0,5 кг на вядро.

Расліны апырскваем два разы з інтэрвалам у тыдзень. Рабіць гэта раніцай або вечарам. Імкнуцца змачыць верх і ніз лісця (зелле канае), стволікі і галінкі.

НАВІНЫ АКЦЫЯНЕРНАГА ТАВАРЫСТВА «БЕЛАГРАПРАМБІРЖА»

БЕЛАГРАПРАМБІРЖА МЕНСК

НА ТАРГАХ У ПЯТНІЦУ, 19 ЧЭРВЕНЯ 1992 ГОДА, БЫЛО ЗАРЭГІСТРАВАНА 20 ЗДЗЕЛАК НА СУМУ 6,7 МІЛЬЁНА РУБЛЕЎ.

Сярод прададзеных і купленых тавараў:

Назва тавараў	Колькасць	Адзіная вымярэння	Цана за адзінку (рублёў)
Збожжа фуражнае і насеннае	280	тона	6.500 —7.200
Ільнасемя, сорт «Аршанскі»	10	тона	10.500
Цукар	23	тона	60.000—63.000
Карбід кальцыю	20	тона	85.000
Стагакід СШР-0,5 без гідрацыліндра	18	шт.	55.000
Бульбакапалка КТН-2В	1	шт.	25.000
Лічыльнік электрычны, аднафазны, індукцыйны СО-11446М, новы	60	шт.	900
Акумулятар 6SE-60 (выт. Польшча)	50	шт.	4.700
Акумулятарныя батарэі 6СТ-50А, 12 в	60	шт.	3.600

ТАРГІ ПРАВОДЗЯЦЦА ШТОТЫДНЁВА, ПА ПЯТНІЦАХ, З 11.00 ПА АДРАСУ:
Мінск, вул. Казінца, 86, корпус 2.
РЭГІСТРАЦЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ З 9.00.
ТЭЛЕФОНЫ ДЛЯ ДАВЕДАК: 77-01-37, 77-07-26.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Першы намеснік галоўнага рэдактара М. МІХАЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін — 32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Тыраж 81.098. Індэкс 63.850. Зак. № 125.
Выходзіць 250 разоў на год. Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12